ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 249 (3357) Серада, 30 кастрычніка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Сазонная, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ЛЁНДАН, 29. Сёньня адкрылася 3-я сэсія ангельскага парляманту. Адказваючы на запытаньні аб узаемаадносінах з СССР, Гэндэрсон заявіў, што у бліжэйшы час ён прадставіць на разгляд парляманту пратакол, які быў падпісаны ім і тав. Даўгалеўскім.

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

ГОМЕЛЬ, 29. У вёсцы Якаве (Веткаўскі раён) укачы 29-га кастр. стрэлам ў вакно забіты антывісты, член праўленьня мясцовага кааператыву і член камісіі па хлебазагатоўках— тав. Пушаў Тодар. На месца забойства выехала камісія з прадстаўнікоў адпаведных органаў.

ХОЙНІКІ, 29. Сёньня адпраўлена ў Ленінград 44 вагоны бульбы. З пачатку кампаніі адгружана 200 вагонаў.

БАРЫСАЎ, 29. Адпраўлена 25 вагонаў бульбы ў Маскву і Ленінград. 25.000 пуд. загатоўлена для рабочых Барысава.

Новая нацыянал-дэмакратычная вылазка

Наша партыя вяла 1 вядзе самую рашучую і бязьлітасную барацьбу з усімі праяўленьнямі нацыянал-дэмакратызму. Партыя выкрывала і выкрывае контр-рэвалюцыйны характар нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі і практыкі. Партыя ажыцьцяўляе выразную клясавую лінію ў справе будаўніцтва сацыялістычнае гаспадаркі, беларускай пралетарскай культуры— будаўніцтва Савецкай Беларусі. Партыя, праводзячы гэту лінію, выбівае нацыянал-дэмакратычныя элемэнты з пазыцый, што займаюцца імі, і з усёй непрымірымасьцю нападае на ўсіх тых, хто зьяўляецца выказчыкам мкненьняў клясавага ворага.

Наша партыя праводзіць у сучасны момант чыстку сваіх радоў. Правяраючы свае рады, партыя павышае сваю палітычную баяздольнасьць. Праводзячы чыстку, партыя правярае, наколькі кожны член партыі на справе ажыцьцяўляе палітыку партыі, наколькі ён змагаецца за чыстату бальшавіцкай лініі партыі і супроць усіх ухілаў ад гэтай лініі.

Чыстка з надвычайнай яскравасьцю паказвае, як кожны, хто ўхіляецца ад правільнай лініі партыі, проста змыкаецца з клясавым ворагам. Клясавы вораг бярэ ўхілістага пад сваю абарону. Ён нават часамі прабуе скарыстаць трыбуну чысткі для таго, каб выказаць салідарнасьць з ухілістым, атакаваць партыю і яе кіраўніцтва. Клясавы вораг пярэдка мае сваіх агентаў і ўнутры нашай партыі, карыстаецца імі для таго, каб выступаць супроць партыі, для таго, каб абараняць антыпартыйныя погляды і тэорыі.

Такі факт мы мелі гэтымі днямі ў часе чысткі ячэйкі Наркамасьветы, пры праверцы т. Жылуновіча. Чаму іменна праверка т. Жылуновіча была скарыстана нацыянал-дэмакратамі і іх прыяцелямі, што знаходзяцца яшчэ ў радох партыі, для таго, каб арганізаваць вылазку супроць палітыкі партыі? Жылуновіч па працягу доўгага часу абараняў нацыянал-дэмакратычныя погляды. Нежаданьне яго да гэтага часу да канца ясна і пабальшавіцку прызнаць свае памылкі—зьявілася па сутнасьці сыгналам да арганізаванага палітычнага выступленьня нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, у часе чысткі т. Жылуновіча, супроць партыі і яе бальшавіцкага кіраўніцтва.

У чым выявілася гэтае выступленьне нацыянал-дэмакратаў? Мы мелі на адкрытым сходзе ячэйкі выступленьне нацыянал-дэмакратаў, накшталт М. Гарэцкага і камуністых Марука, Івана Цьвікевіка, Ільлючонка і інш., якія аднадушна ўзялі пад сваю абарону памылкі т. Жылуновіча і, больш таго,—разгарнулі цэлую сыстэму нацыянал-дэмакратычных, антыпартыйных поглядаў.

Марук, Ільлючонак, Іван Цьвікевіч выступілі з шалёнай атакай на партыю, на самую ідэю чысткі. Гэта кампанія выступіла з наглымі абвінавачаньнямі ў тым, што чыстка партыі—гэта «паказальны судовы працэс», што гэта «суд», што гэта «пракуроршчына». Вуснамі гэтых асоб, якія пралезьлі ў рады партыі, гаварыў наш клясавы вораг, які прабуе скарыстаць чыстку партыі для таго, каб зганьбіць нашу партыю.

Побач з гэтымі адкрыта-антыпартыйнымі выпадамі група гэта прабавала высунуць супроць партыі абвінавачаньне ў тым, што, быццам-бы, барацьба з нацыянал-дэмакратызмам зьяўляецца праяўленьнем вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, зьяўляецца барацьбой з «беларускасьцю». Наша партыя заўсёды вяла і вядзе самую бязьлітасную барацьбу як супроць вялікарускага, так і ўсякіх іншых шавінізмаў, супроць русацэнтызма, даючы рашучы адпор малейшым вылазкам вялікарускіх шавіністых. Наша партыя праводзіць і будзе і надалей з усёй цьвёрдасьцю праводзіць лінію на беларусізацыю і будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры. Марукі, Цьвікевічы, Ільлючонкі і ім падобныя, робячы паклёп на палітыку партыі, паўтараюць тое, што гаворяць польскія фашыстыя і беларускія нацыянал-фашыстыя. «Паход Масквы на беларусоў», «барацьба з беларускасьцю» і г. д. і г. д.—як знаёмы гэтыя матывы ў контр-рэвалюцыйных песьнях нашых ворагаў! Гэты паклёп асабліва ходка ідзе на біржы антысавецкай агітацыі і прапаганды, тады калі пралетарыят, пад кіраўніцтвам сваёй Камуністычнай партыі, падаўляючы супраціўленьне клясавых ворагаў, атрымлівае перамогу за перамогай на фронце сацыялістычнай будоўлі.

У процілегласьць нашай барацьбе супроць нацыянал - дэмакратызму Ільлючонак, Марук і К° ідэалізацыяй і хвальбою мінулага Жылуновіча, абараняюць нацыянал - дэмакратычныя тэорыі сёнешняга дня.

Заявамі аб тым, што «Беларусь стваралася рукамі Жылуновіча», што «Жылуновіч прыцягнуў да савецкай улады большасьць беларускай інтэлігенцыі», і іншымі старымі песенькамі, апіраючыся па «аўтарытэт» сякіх-такіх артыкулаў з «Полымя»,—яны прабавалі падкрэсьліць, што будаўніцтва БССР ішло наперакор партыі. Ні партыя, ні рабочая кляса, а Жылуновіч і група нацыянал-дэмакратычных інтэлігентаў будавалі, па іх думцы, Савецкую Беларусь. Гэтыя пропаведзі проста чытаны па тэзісах Луцкевіча і яго нацыянал-фашысцкай кампаніі!

Такім чынам, на гэтым сходзе мы мелі падрыхтаваныя выступленьні нацыянал-дэмакратычнай групы з загадзя разьмеркаванымі ролямі ў барацьбе супроць партыі, супроць яе Цэнтральнага Камітэту.

Палітычны сэнс гэтых выступленьняў зусім ясны. Гэта была вылазка клясавага ворага, апрапутага ў форму беларускага нацыянал-дэмакратызму і гаварыўшага вуснамі асобных камуністых, накшталт Марука, Івана Цьвікевіча і Ільлючонка. Таму невыпадкова супалі гэтыя выступленьні з выступленьнем адкрытых нацыянал-дэмакратаў.

Для партыі ясна, што абарона нацыянал - дэмакратычных поглядаў, якія мы мелі з боку Марукоў, Цьвікевічаў і Ільлючонкаў, атакі на партыю і яе кіраўніцтва—несумяшчальны з прабываньнем у радох партыі. Ня можа быць месца ў партыі людзям, якія змагаюцца супроць партыйнай лініі нацыянал-дэмакратычнай зброяй.

Камуністыя, беспартыйныя рабочыя і прадстаўнікі працоўнай інтэлігенцыі далі належны адпор на самым сходзе вылазкам нацыянал-дэмакратаў. Усе арганізацыі нашай партыі нанясуць руйнуючы ўдар новай спробе нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў супроць паставіць сваю лінію бальшавіцкай лініі партыі. Партыйныя масы ў адказ на гэтую вылазку яшчэ цясьней згуртуюцца наўкола бальшавіцкага ЦК і будуць цьвёрда праводзіць у жыцьцё правільную ленінскую лінію партыі.

„КРАІНА САВЕТАЎ" У ДЭТРОЙЦЕ

Экіпаж быў спатканы з энтузіязмам

ДЫРБОРН, 28. У панядзелак а 1 гадз. 35 мін. па мясцовым часе прыляцеў самалёт «Краіна Саветаў» у Дэтройт, дзе быў спатканы прадстаўнікамі Форда, старшынёю Амторга і шматлікімі грамадзянамі гораду.

Палёт з Чыкаго адбыўся пры моцным сустрэчным ветры, пры чым 110 клм. было зроблена над возерам Мічыган.

Экіпаж «Краіны Саветаў» быў спатканы на аэрадроме Форда з энтузіязмам. Вялізарны натоўп, які чакаў прылёту «Краіны Саветаў», вдпіхнуў афіцыйны камітэт, абраны для спатканьня лётнікаў. У гонар лётнікаў было дана сьнеданьне, на якім з віншаваньнем і прывітаньнем выступіў Форд.

Па СССР

За несваячасовую здачу сум—да крымінальнай адказнасьці

ПАСТАНОВА СНК СССР

МАСКВА, 28. Праведзеная Наркамфінам Саюзу ССР праверка паступленьня ў даход казны сум, атрыманых па калектыўнай падпісцы на 2-ю пазыку індустрыялізацыі, паказала, што цэлы рад устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый, наперакор інструкцыі Наркамфіну СССР, затрымлівалі здачу гэтых сум, часова выкарыстоўваючы іх не па прызначэньні.

Саюзны СНК устанавіў, што ўстановы павінны праводзіць атрыманыя ўзносы па ведамасьцах выплаты зарплаты, пры чым установы і прадпрыемствы, якія знаходзяцца на дазаржбюджэце, здаюць гэтыя ўзносы крэдытным установам у дзень выдачы зарплаты ў парадку безналічных разрахункаў. Прадпрыемствы-ж, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку, здаюць гэтыя сумы не пазьней 3-х дзён са дня паступленьня ўзносаў ад падпісчыкаў пазык. Крэдытныя ўстановы, якія знаходзяцца ў гарадох, здаюць атрыманыя ад устаноў узносы ў мясцовы філіял дзаржбанку Саюзу ССР на наступны дзень пасьля атрыманьня гэтых сум.

Саюзны СНК пастанавіў прыцягваць да крымінальнай адказнасьці асоб, якія незаконна затрымліваюць атрыманыя па калектыўнай падпісцы ўзносы.

СУСЬВЕТНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ САВЕЦКАЕ ПЯЦІГОДКІ

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 28. Камэнтуючы пяцігодку, бесьперапынку і калектывізацыю сельскай гаспадаркі ў СССР, канстантынопальская газэта «Акшам» падкрэсьлівае сусьветнае значэньне вопыту, які адбываецца ў СССР. «Савецкі Саюз, — піша газэта, — напружвае ўсе сілы, каб ажыцьцявіць нябачаныя вялізарныя пачынаньні, ад вынікаў якіх залежыць яго будучыня».

Пабудова 3-х новых гарадоў у раёне Сталінграда

СТАЛІНГРАД, 28. Спэцыяльная ўрадавая камісія прыступіла да пабудовы ў раёне Сталінграда трох новых гарадоў: Сталінград-Паўночны, Сталінград-Стары і Сталінград-Паўднёвы.

У гутарцы з карэспандэнтам Роста, старшыня камісіі т. Хвесін паведаміў, што паводле пяцігадовага пляну ў розных галіны народнае гаспадаркі Сталінграда будзе ўложана 1.200 мільёнаў р. Будзе пабудавана ў раёне Сталінграда 47 заводаў і фабрык. У сувязі з гэтым узьнікае грандыёзная задача разьмясьціць усе гэтыя пабудовы такім чынам, каб усе элемэнты народнае гаспадаркі былі мэтазгодна зьвязаны паміж сабою на падставе эканамічнай і тэхнічнай узаемнай залежнасьці і ўзаемнага абслугоўваньня.

—Мы ставім перад сабою задачу,—сказаў т. Хвесін,—поўнага аграмаджаньня і задавальненьня ўсіх бытавых і сацыяльна-культурных патрэб працоўных будучых сацыялістычных гарадоў у раёне на 40 клм. ад Сталінграда.

Парламанцкія выбары ў Чэха-Славакіі

ПРАГА, 28. Парламанцкія выбары скончаны па ўсёй Чэха-Славакіі. Вынікі першага галасаваньня вядомы пакуль што па 20 выбарчых акругах з агульнага ліку 23. Папярэднія вынікі выбараў паказваюць, што з партый ранейшай буржуазнай кааліцыі выйгралі толькі аграрыі. Сярод партый кааліцыі, якія праігралі—нацыянал-дэмакраты, ім не дапамаглі нават антысавецкія фокусы перад выбарамі. Пралічыліся таксама славацкія клерыкалы, якія чакалі значнага прыросту галасоў у сувязі з асуджэньнем іх дзеяча Тукі.

Належыць адзначыць, што фашыстыя, якія выступалі на парламанцкіх выбарах упярэдзе, атрымалі 2 мандаты. Ад фашыстых абраны славуты Гайда. Значны прырост галасоў маюць сацыял-рэфармістыя ўсіх адценьняў, асабліва чэскія сацыял-дэмакраты.

Адстаўка Чэха-славацкага ўраду

ПРАГА, 28. У сувязі з выбарамі ў парлямант прэм'ер міністар перадаў прэзыдэнту Масарыку заяву аб адстаўцы ўсяго ўраду. Адстаўка прынята.

ПАЎСТАНЦКІ РУХ У ГУАНДУНІ

ШАНХАЙ, 28. У Гуандуні працягваецца дзейнасьць паўстанцкіх кітайскіх атрадаў. Да некаторых атрадаў, паводле вестак кітайскіх газэт, далучыліся групы салдат Чжан Фа-гуя. Сялянскімі атрадамі заняты ў Яншэнскім раёне гарады Пэйлян і Тайпін і яны пагражаюць галоўнаму гораду раёну—Яншану. У раёне Хінінсяна камуністычнымі атрадамі пад камандай Чу Дэ заняты Вэйсян. Стварылася простая пагроза Шыін-сяну.

СЛОВА РАБОЧЫМ МЕНШІВЭЮ

Адкрыты ліст 1.500 рабочых фабрыкі „Кастрычнік"

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ: Павялічыць прадукцыйнасьць працы на 40 проц. Зьнізіць сабекошт на 11 з палов. проц. Ліквідаваць прастоі, арганізаваць масавую праверку калдагавароў

МЫ ПРОСІМ: Выконваць прапановы вытворчых нарад. Палепшыць ахову працы і тэхніку бясьпечнасьці. Уключыць у плян пабудову клюбу, сталоўкі і ясьляй

ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЯЦІГОДКІ У 4 ГАДЫ, ЗА УЗАЕМНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ КАЛДАГАВОРУ

Ліст 1.500 рабочых швэйнай фабрыкі „Кастрычнік" да ўсіх рабочых БССР

Нячувана цяжкія былі ўмовы работы швэйнікаў у часе панаваньня капіталістых і памешчыкаў. Толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя вызваліла рабочых-швэйнікаў ад уціску гаспадарнікаў, ад цемры і страшэннай эксплёатацыі. Замест душных, брудных, маленькіх майстэрань, у Менску ВЫРАСЛА БУЙНАЯ, ПАБУДАВАНАЯ ПА АПОШНІМ СЛОВЕ ТЭХНІКІ І САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ШВЭЙНАЯ ФАБРЫКА «КАСТРЫЧНІК». 10 ГОД НАЗАД ЯНА МЕЛА 8 РАБОЧЫХ, ЗАРАЗ—1.500.

Рад труднасьцяй перажылі мы ў сваёй рабоце. Вялікі і хуткі рост швэйнай прамысловасьці выклікаў наплыў на швэйную фабрыку новых рабочых, якія ня зусім усьвядомілі задачы сацыялістычнага будаўніцтва. Вось чаму ў мінулым годзе мы мелі факты зьнижэньня якасьці прадукцыі, рвацтва і прагулы.

Пры дапамозе абсалютнай большасьці рабочых фабрычным арганізацыям удалося даць адпор рвачом і прагульшчыкам і наладзіць вытворчасьць. Зараз сабекошт прадукцыі ў параўнаньні з 1927-28 годам зьнізіўся на 6,5 проц., прадукцыйнасьць працы павялічылася на 37 проц., сабекошт шыцьця аднаго паліта зьнізіўся на 48 проц.

Рабочы калектыў фабрыкі «Кастрычнік» заўсёды актыўна падтрымліваў важнейшыя мерапрыемствы партыі і савецкай улады.

Рабочыя і служачыя фабрыкі далі стопроцантную падпіску на 3-ю пазыку Індустрыялізацыі краіны.

Мы адпрацавалі адзін дзень на карысьць індустрыялізацыі, заработак за працу ў дзень яўрэйскага новага году мы аддалі на падтрымку самалёту «Біра-Біджан» і на куплю трактара для падшэфнай вёскі, на агульна-фабрычным мітынгу мы прынялі пастанову ВЫКАНАЦЬ ПЯЦІГОДКУ ФАБРЫКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ.

У адказ на хлусьню трацкістых аб тым, што 7-гадзінны рабочы дзень правесьці немагчыма, мы агульнымі намаганьнямі рабочых фабрыкі пад кіраўніцтвам партыйнай ячэйкі перайшлі на 7-гадзінны рабочы дзень і на працягу 4-х месяцаў дабіліся вялізных посьпехаў.

На заклік ЦО партыі «Правда» аб агляндзе вытворчых нарад адгукнуліся сотні рабочых нашай фабрыкі, якія далі шмат каштоўнейшых прапаноў, як палепшыць вытворчасьць і работу вытворчых нарад.

Рабочыя нашай фабрыкі правільна зразумелі сацыялістычнае спаборніцтва: у нас арганізаваны ўдарныя брыгады і цэлыя ўдарныя цэхі; у работу вытворчых нарад уцягнута вялікая колькасьць рабочых нашай фабрыкі.

Усе гэтыя дасягненьні, атрыманыя за кароткі пэрыяд, гаворяць аб тым, што мы пераможам труднасьці выкананьня генэральнага пяцігодавага пляну і дакажам усёй міжнароднай буржуазіі і сацыял-фашысцкім пёкаям, што пралетарыят Савецкага Саюзу СВАІМІ СІЛАМІ МОЖА ПАБУДАВАЦЬ САЦЫЯЛІЗМ.

Зараз, у момант разгортваньня кампаніі па перазаключэньні калдагавароў, якая праводзіцца ў момант мацнейшага абастрэньня клясавай барацьбы ў нашай краіне, мы бярэм на сябе абавязак УЗЬНЯЦЬ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ НА 40 ПРОЦ., ЗЬНІЗІЦЬ САБЕКОШТ ПРАДУКЦЫІ НА 11 З ПАЛОВ. ПРОЦ., ДАВЕСЬЦІ ПРОЦАНТ ПЕРАРОБАК ДА МІНІМУМУ, ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАСТОІ Ў НАШАЙ РАБОЦЕ.

Мы абвяшчаем вайну ўсім злосным прагульшчыкам і рвачом і ня спынімся перад выдаленьнем іх з нашай сацыялістычнай фабрыкі.

Мы абавязваемся на 100 проц. удзельнічаць у сацыялістычным спаборніцтве і арганізаваць масавую праверку выкананьня калдагавору.

Узяўшы на сябе абавязак выкананьня кантрольных лічбаў на 1929-30 год, мы просім кіруючыя органы партыі і ўлады забясьпечыць выкананьне адміністрацыяй фабрыкі наступных умоў.

1. Бесьперабойнае забесьпячэньне нашай фабрыкі сырцом.
2. Хуткае выкананьне намечаных мерапрыемстваў па тэхніцы бясьпечнасьці і ахове працы.
3. Сваячасовыя і правільныя разьлікі.
4. Хуткае ажыцьцяўленьне прынятых адміністрацыяй пастаноў вытворчых нарад і прэміяваньне за вынаходніцтва.
5. Пабудова на тэрыторыі фабрыкі памяшканьня для вядзеньня культурнамасавай работы, сталоўкі і ясьляй.

Мы бярэм на сябе абавязак дапамагаць каапэрацыі ў яе рабоце шляхам вылучэньня лепшых рабочых у каапэрацыйна-крамныя камісіі і апарат ЦРК. Мы абавязваемся зусім пагасіць пай; з свайго боку мы просім наладзіць бесьперабойнае забесьпячэньне рабочых прадуктамі першай патрэбы і зьнішчыць чаргі.

Мы заклікаем усіх рабочых БССР адкінуць хістаньні, змагацца з ныцьцём правых ухілістых і прыпажыць усе намаганьні на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, на выкананьне баявога пэзунгу партыі—дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны.

За выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, за стопроцантны ўдзел рабочых у сацыялістычным спаборніцтве, за ўзаемнае выкананьне калдагавору.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ўперад да сацыялізму!

Па даручэньні агульна-фабрычнага мітынгу:

БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВУ І ФАБРЫЧНЫ КАМІТЭТ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК».

Рвачом няма месца на нашых заводах

Заклік ініцыятыўнай групы старых рабочых

Мы, ініцыятыўная група старых рабочых швэйнай фабрыкі «Кастрычнік», зварачаемся да ўсіх рабочых БССР з наступнай заявай.

Мы прыступаем да выкананьня задач другога году пяцігодкі ва ўмовах бурнага росту нашай прамысловасьці і фарсаванага наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, ва ўмовах, калі міжнародная буржуазія і клясавыя ворагі ўнутры краіны робяць усё магчымае, каб падарваць нашу эканамічную моц ва ўмовах труднасьцяй рэканструкцыйнага пэрыяду. Адсталыя пласты рабочай клясы, якія нядаўна прышлі з вёскі, могуць скарыстаць кампанію перазаключэньня калдагавароў для прад'яўленьня рвакіх патрабаваньняў да гаспадарчых органаў. Мы заклікаем усіх рабочых БССР, у асаблівасьці рабочых швэйнікаў, даць рашучы адпор вылазкам рвачоў і прагульшчыкаў, выкрываць учынкі агентаў клясавага ворага, якія пралезьлі на нашыя прадпрыемствы. Мы абавязваемся весьці растлумачальную работу сярод адсталых груп рабочых нашай фабрыкі і рашуча змагацца з тымі, хто будзе прад'яўляць рвацкія патрабаваньні.

Мы прапануем усім рабочым у часе калдагаворнай кампаніі рзальна, сьвядома падыйсьці да заключэньня калдагавору, улічваць магчымасьці нашых фабрык і заводаў, улічваць запатрабаваньні прамфінпляну.

Рвачом няма месца на нашых заводах!

За моцную працоўную дысцыпліну, за далейшы ўздым прадукцыйнасьці працы, за зьнижэньне сабекошту!

Уперад, да індустрыялізацыі краіны!

Коўнэр, Бярковіч, Эйдэльман, Каплан, Ерашынскі, Мукасей, Фэрдман, Бэрман, Фэрдман К., Каган, Бухман, Раксін, Эпштэйн Б., Олін, Лабецкая, Вайнэр, Кальтман, Нізак, Рохкінд Ф.

Не паслабляць тэмпу хлебазагатовак

Слабы тэмп хлебазагатовак у першым квартале (чэрвень-верасень), у выніку прынятых мерапрыемстваў партыйнымі арганізацыямі, савецкімі органамі і загатоўшчыкамі, вымяніўся бурным ростам загатовак у кастрычніку.

У першым квартале намі выканана 20 проц. гадавога пляну, а за 25 дзён кастрычніка мы выканалі 53 проц. гадавога і 119,4% месячнага пляну і, такім чынам, маем на 25-га кастрычніка выкананьне гадавога пляну хлебазагатовак у разьмеры 73,3 проц.

У сярэднім у кастрычніку штодзенна на склады загатоўшчыкаў паступала каля 70 тысяч пудоў збожжа. У параўнаньні з загатоўкамі мінулага году, мы вараз ідзем амаль у 8 раз хутчэй.

Пасьпяховы тэмп выкананьня хлебазагатоўчага пляну тлумачыцца добрым ураджаем, увагай да гэтай справы пізавых партыйных арганізацый, асабліва ва апошні час, і ўцягненьнем у справу хлебазагатовак асноўных мас сялянства — бедноты і сераднякоў і мабілізацыяй грамадзкай думкі вакол хлебазагатовак.

Прызнаючы здавальняючым выкананьне гадавога і месячнага плянаў у сярэднім па ўсёй БССР, усё-ж трэба адзначыць, што некаторыя акругі адстаюць ад гэтага сярэдняга процанту.

На першым месцы з тых, што адстаюць, ідзе Мазырская акруга — 60 проц. (і то пры яе нікчэмным пляне), на другім Бабруйская акруга — 61,5, на трэцім Гомельская — 65,4 і на чацьвертым ідзе Магілёўская — 71,5 проц. Усе гэтыя акругі, апрача Мазырскай, важны тым, што яны ў хлебазагатоўках займаюць рашучае месца — 58 проц. усяго хлебазагатоўчага пляну і таму мясцовыя арганізацыі павінны дамагчыся да таго, каб вытрымаць да канца дасягнуты за апошні час высокі тэмп і не адставаць ад сярэдняга процанту выкананьня пляну хлебазагатовак па БССР.

У сувязі са здавальняючымі вынікамі загатовак за кастрычнік, мы не павінны дапушчаць на мясцох ніякіх дэмабілізацыйных настрояў, ня траціць галавы ад дасягнутых посьпехаў, а в яшчэ большай энэргіяй узяцца за 100-процантнае выкананьне пляну хлебазагатовак, у першую чаргу націскаючы на кулака, які пакуль яшчэ сабатуе продаж хлеба і бульбы дзяржаве. Трэба паставіць перад сабою задачу выканаць 100 проц. пляну да 12-й гадавіны Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

У далейшым трэба разьвіваць грамадзкія мэтады па хлебазагатоўках і ўзмацніць растлумачальную работу сярод бядняцка-сераднякіх мас, не дапускаючы ў адносінах да іх прымусовых мер узьдзейнічаньня. Больш шырока выкарыстаць рабочыя брыгады, арганізаваць брыгады з бядняцка-сераднякага актыву тых раёнаў, якія ўжо выканалі свае заданьні на 100 проц. і пасьпаць іх у раёны, якія больш адстаюць. Ва ўсіх раёнах правесьці праверку выкананьня абавязковых заданьняў кулакамі, калі нават плян па раёне выкананы, але ліпкі хлеба ў кулака ня былі цалкам закрануты, даць дадатковае заданьне спэцыяльна для кулакоў, устанавіўшы тэрміны продажу імі хлеба ня больш 10 дзён.

Поравень з посьпехамі трэба адзначыць і недахопы. Першым з іх трэба адзначыць зьнижэньне ўдзельнае вагі жыта і пшаніцы за лік павялічэньня пехарчовых культур. Гэта становішча ненармальнае і яго неабходна рашуча зьмяніць, павысіўшы ўдзельную вагу жыта і пшаніцы ня ніжэй, чым на 60 проц. у сярэднім.

Недапушчальна марудна выконваецца кантрактацыя. Нават у тых раёнах, дзе плян выкананы на 100 проц., спагнаньне хлеба па кантрактацыі ідзе надзвычайна слаба.

Трэба прыняць усе меры ўзьдзейнічаньня, паводле узаемных праў бакоў, якія дагаворваюцца, г. зн. дзяржавы і сялянства.

Трэба з дапамогаю таварышоў і рабочых брыгад, якія выехалі на месцы, праверыць кантрактацыю па сутнасьці, у каго кантрактаваўся хлеб, на якую колькасьць, ці няма тут з боку сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі фармальнага выкананьня кантрактацыі. Сярэдзінкія-такія сыгналы аб тым, што хлеб закантрактаваны ў тых, у каго яго няма, ужо ёсьць, а гэта ўжо ўтрудняе выкананьне кантрактацыі. Пры тых посьпехах, якія мы маем на хлебазагатоўчым фронце, адставаньне ў выкананьні закантрактаванага хлеба зьяўляецца агідным зьявішчам, кампрамэтуючым важнейшае мерапрыемства дзяржавы на вёсцы.

Адстаюць таксама і калгасы. Трэба і тут націскаць. Выканаўшы сваё заданьне, калгасы павінны быць усебакова падтрыманы як у сэнсе таварнага прэміраваньня, так і па лініі крэдытаў і інш. дапамогі, да тых-жа, якія сабатуюць і зьвязваюцца з прыватнікам, трэба ўжыць меры ўзьдзейнічаньня — пабаўленьне крэдытаў і ўсялякай іншай дзяржаўнай дапамогі. Акрамя таго, павінен быць праверан склад такіх калгасаў, бо ёсьць выпадкі, што дзе-ні-дзе пралазяць кулакі ў калгасы, каб там шкодзіць, зрываць іх знутры і напэўна пачынаецца гэта з сабатаваньня здачы хлеба дзяржаве.

Таксама на мясцох трэба зьвярнуць увагу на паляшэньне арганізацыі па прыёмцы і спатканьні чырвоных абозаў. Менш бутафорыі, больш практычнага падыходу пры сустрэчы з сялянствам.

Нікуды ня варта такая пастаноўка, калі сяляне цэлымі гадзінамі еьдзяць па горадзе ў пошуках складу і на самым складзе чакаюць цэлы дзень здачы хлеба. Трэба рашуча змагацца з абсалютна недапушчальнымі выпадкамі нявыплаты сялянству гатоўкаю за зданы хлеб. Загатоўчым і каапэрацыйным цэнтрам трэба забясьпечыць месцы выстарчальнымі крэдытамі і не тармазіць адсутнасьцю грошай выкананьне пляну ў тэрмін і цалкам.

Наперадзе ў нас яшчэ вялікая і цяжкая задача. Лягчэй выканаць 73 проц. з пачатку кампаніі, чым 27 проц. к канцу і таму трэба, непаслабляючы энэргіі, ісьці наперад да 100-процантнага выкананьня хлебазагатоўчага пляну, папраўляючы ў працэсе работы дапушчаныя памылкі.

К. БЕНЭК.

Замежныя рабочыя дэлегацыі ў СССР

ЛЁНДАН, 23. Апублікаваны сьпіс сяброў дэлегацыі, якая выяжджае ў СССР для ўдзелу ў сьвяткаваньні 12-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Дэлегацыя складаецца цалкам з рабочых. Уваходзяць прадстаўнікі ад наступных прафэсій: чыгуначнікаў, гарнякоў, электрыкаў, ліцейшчыкаў, судна-будаўнікоў, тэкстыльшчыкаў, каменнацёсаў, сельгаспрабочых і інш.

ПАРЫЖ, 24. «Юманітэ» публікуе першыя весткі аб абраньні ў буйных прамысловых цэнтрах дэлегатаў-работніц для паездкі ў СССР на сьвяткаваньне гадавіны Кастрычніка. Паведамленьні аб пасылцы жаночай дэлегацыі сустракаюцца ўсюды з энтузіязмам. У некаторых раёнах дэлегаткі ўжо абраны.

* * *

ЛЁНДАН, 26. Рабочая дэлегацыя, якая выяжджае ў СССР на Кастрычніцкія сьвяты паводле запрашэньня ЎсеЦСПС будзе складацца з 35 чалавек. Апрача таго, 7 дэлегатаў выяжджае з Ірляндыі, у тым ліку 1 жанчына. Ангельская, Ірляндзкая і французская дэлегацыі выяжджаюць з Лёндану ў сераду на савецкім параходзе «Рудзутак» і павінны прыехаць у Ленінград 4-га лістапада.

* * *

РЭВЕЛЬ, 28. На 12-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі ў СССР прыяжджае дэлегацыя прадстаўнікоў левага крыла эстонскага прафруху ў складзе 24-х чалавек.

* * *

ПАРЫЖ, 28. Орган камуністычнае партыі «Юманітэ» заклікае ўсіх рабочых, салдат і маракоў пасылаць на 12-ю гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі індывідуальныя і калектыўныя лісты савецкім рабочым і сялянам; у гэтых лістох павінна быць намалявана барацьба францускіх рабочых у абарону Кастрычніцкай рэвалюцыі ў СССР.

Рэвалюцыйныя дэманстрацыі ў Вене і Гамбургу

На заклік кампартыі рабочыя Вены вышлі на дэманстрацыю

Крывавая сутычка з паліцыяй

ВЕНА, 28. Венскія рабочыя шырока адгукнуліся на заклік кампартыі і прынялі ўдзел у масавай дэманстрацыі. Ня гледзячы на паліцэйскую забарону, рабочыя выходзілі асобнымі групамі праз бульвары на пляц, дзе быў назначаны збор. Моцныя паліцэйскія атрады, якія занялі ўсе подступы да пляцу, разганялі дэманстрантаў, пусьціўшы ў ход гумовыя палкі і арыштавалі дзесяткі рабочых. Дэманстранты зноў стыхійна сабраліся. Перад сабранымі выступіў з прамоваю член ЦК аўстрыйскай кампартыі Бэнэдыкт.

Як толькі Бэнэдыкт пачаў прамову, паліцэйскія кінуліся да яго, каб арыштаваць. Бэнэдыкт, аднак, гаварыў далей сваю прамову. Рабочыя ўпарта змагаліся за аслабаненьне Бэнэдыкта. Паліцыі ўдалося перамагчы толькі пасьля таго, як яна атрымала новае падмацаваньне і раён сутычкі быў адрэзаны ад навуковых вуліц. Паліцыя пусьціла тады ў ход шашкі, параніла шмат рабочых і 162-х арыштавала.

З ліку арыштаваных пакінуты пад вартаю 27 рабочых. У часе сутычкі некалькі паліцэйскіх былі зьбіты рабочымі, якія абаранялися.

Паход супроць кампартыі ў Амэрыцы

НЬЮ-ЁРК, 28. У ПАЗШ вядзецца ўзмоцнены паход супроць камуністычнай партыі. Асабліва камуністыя прасьледуюцца ў штаце Ілінойс, у заходніх раёнах Пэнсыльваніі і ў штаце Паўночнай Караліны, дзе левыя прафсаюзы вядуць кампанію па арганізацыі рабочых вугальнай, сталёвай і тэкстыльнай прамысловасьці. У штатах пачалі зноў ужываць старыя законы аб мецяжы, з відавочнай мэтаю загнаць кампартыю ў падпольле.

Ахвяры вэнгерскіх катаў

У ЧАСЕ ГАЛАДОЎКІ ЗАМУЧАНЫ КАМУНІСТЫ ЛЕВІ

ВЕНА, 28. Паводле атрыманых афіцыйных вестак з Будапэшта, учора памёр у будапэшцкай турме Ляксандар Леві, які праводзіў галадоўку разам з іншымі камуністымі.

С.-д. міністар Зэвэрынг падрыхтоўвае закон супроць кампартыі

БЭРЛІН, 25. Апублікаваны ў канчатковай форме законапраект аб ахове рэспублікі, апрацаваны міністрам унутраных спраў, сацыял-дэмакратам Зэвэрынгам.

Законапраект зьяўляецца па сутнасьці выключна законам супроць камуністычнай партыі. У процілегласьць папярэднім законапраектам новы канчатковы законапраект Зэвэрынга накіраваны амаль выключна супроць рэвалюцыйнага пралетарыяту

Канфлікт у вугальнай прамысловасьці Славеніі

ВЕНА, 25. З Белграду паведамляюць, што рух рабочых на капальнях у Травільлі (Славенія) за зарплату скончыўся кампрамісам, заключаным рэфармісцкімі і хрысьціянскімі прафсаюзамі з прадпрыемцамі. Адміністрацыя капальняў згадзілася выдаць рабочым адначасовую дапамогу і аднавіць ранейшы калдагавор, не павышаючы, аднак, заработнае платы.

Кампраміс выклікаў вялікае незадавальненьне горнарабочых, якія рашуча адхілілі гэту спробу прадпрыемцаў. Гарнякі энэргічна рыхтуюцца да працягваньня барацьбы.

Партыйнае будаўніцтва

Чыстка савецкіх ячэек КП(б)Б

Папярэднія вынікі чысткі

(Па матар'ялах ЦКК КП(б)Б)

Чыстка савецкіх ячэек КП(б)Б пачалася з 15-га верасьня. Да пачатку чысткі акруговымі КК былі складзены праверачныя камісіі, якія прыступілі да практычнага правядзеньня праверкі і чысткі. Праверкомы ў асноўным складаюцца з тых таварышоў, якія праводзілі чыстку вясковых і вайсковых арганізацый КП(б)Б. Па двух рабфах Менску было створана 12 праверкомаў, якія праводзяць чыстку 54 савецкіх ячэек.

Трэба адзначыць, што ў практыцы падрыхтоўчай работы асобнымі арганізацыямі і раённымі камітэтамі партыі не праведзены ўсе тыя мерапрыемствы, якія-б поўнасьцю забясьпечылі пасьпяховае правядзеньне чысткі савецкіх ячэек.

Бабруйская арганізацыя правяла агульную агітацыйна-растлумачальную работу па падрыхтоўцы да чысткі. Пытаньні праверкі і чысткі ня раз прапрацоўваліся на агульных партыйных сходах, на якія прыцягваліся беспартыйныя. У асноўным камуністыя і беспартыйныя рабочыя і служачыя правільна ўсьвядомілі задачы і прынцыпы чысткі. Але практычная работа да праверкі на **падрыхтоўцы канкрэтных матар'ялаў** зусім не праводзілася. **Характарыстыкі, складзеныя на ячэйкі Бабруйскім гарадзкім камітэтам партыі, зусім не адпавядаюць сапраўднасьці і не адбіваюць становішча ячэек.**

Трэба адзначыць слабую ролю **насьценных** газэт у падрыхтоўчай рабоце. На скліканай нядаўна Мен. АКК нарадзе рэдкалегій насьценгазэт савецкіх устаноў высьветлілася, што насьценгазэты бадай зусім ня бралі ўдзелу ў падрыхтоўчай рабоце. Канкрэтных матар'ялаў аб рабоце ячэйкі насьценгазэта не зьмясьціла. Многія газэты баяцца самакрытыкі і не зьмяшчаюць заметак, якія крытыкуюць і выкрываюць антыпартыйныя паводзіны асобных членаў партыі. У насьценгазэтах часамі зьмяшчаюцца заметкі, дзе прозьвішчы камуністых захоўваюцца пад ініцыяламі. Такія факты мелі месца ў насьценгазэтах ВСНГБ і Акадэміі Навук. Прыклад актыўнай падрыхтоўчай работы паказала рэдкалегія насьценгазэты **Наркамзему.** Рэдкалегія склікала тры нарады насьценкораў, зьмясьціла рад матар'ялаў аб рабоце ячэйкі і г. д.

Далейшымі задачамі рэдкалегіі ў падрыхтоўчай рабоце павінны зьявіцца наступныя пытаньні: правядзеньне агляду ячэек, асьвятленьне важнейшых вучасткаў партыйнай работы і работы асобных камуністых і г. д. Для большага прыцягненьня рабочых мас да ўдзелу ў чыстцы былі створаны партыйна-абсьледваўчыя брыгады —у іх ўвайшлі рабочыя прадпрыемстваў. У асобных арганізацыях (Менск, Віцебск) брыгады сябе апраўдалі, але ў асобных выпадках у практыцы брыгад былі дапушчаны памылкі і скажэньні. Брыгада, вылучаная ў дапамогу камісіі па чыстцы ячэйкі **Белсампрамсаюзу,** бязьдзейнічала, брыгада ў Белдзяржстраху дапусьціла грубыя памылкі, праводзіла няправільную лінію ў сваёй рабоце.

Чыстка савецкіх ячэек **у Віцебску** праходзіць без выстарчальнай увагі з боку партыйнай грамадзкасьці. У выніку слабой падрыхтоўкі **зрываліся** праверачныя сходы (Балпэдтэхнікум, палітэхнікум, міліцыя і г. д.).

У Менску таксама ёсьць рад фактаў дрэннай падрыхтоўкі. (Асобныя праверачныя сходы (яч. акрза, акрфа і г. д.) зрываліся, удзел беспартыйных яшчэ слабы; камсамольскія арганізацыі бяруць слабы ўдзел у чыстцы).

З боку Мен. АК КП(б)Б ня былі прыняты патрэбныя меры для зьнішчэньня гэтых недахопаў. Толькі зусім нядаўна па ініцыятыве АКК быў скліканы сход камсамольскага актыву, які ўхваліў рад канкрэтных мерапрыемстваў па прыцягненьні камсамольскіх арганізацый да ўдзелу ў чыстцы.

Першыя дні чысткі паказваюць, што асобныя савецкія ячэйкі ня справіліся з пастаўленымі перад імі задачамі і дапусьцілі права-апартуністычныя памылкі і скажэньні правільнай лініі. Праверкомы пры дапамозе радавых партыйцаў і беспартыйных рабочых і служачых выкрываюць усе хібы ў рабоце ячэек і асобных камуністых.

Пры праверцы ячэйкі **акрфа (Бабруйск)** праверком выявіў наяўнасьць правай практыкі ў апараце: на дзесяткі тысяч рублёў былі недаабкладзены непманы і гандляры; партыец, інспэктар III-га вучастку недаабкладваў папоў і прыватнікаў і ў той-жа час адмаўляў прапоўным саматужнікам у законных льготах.

Пры чыстцы ячэйкі **Сампрамсаюзу** (Бабруйск) былі выкрыты абураючыя факты зажыму самакрытыкі і кругавой парукі.

На першых сходах па чыстцы партячэйкі **акрза (Віцебск)** былі выяўлены факты права-ўхілісцкай дзейнасьці асобных партыйцаў. Бюро ячэйкі праводзіла апартуністычную лінію, зажымала самакрытыку і не рэагавала на канкрэтныя праяўленьні правага апартунізму. У ячэйцы працасьветы **(Віцебск)** таксама выкрыты скажэньні партыйнай лініі ў практычнай рабоце.

Усе гэтыя факты праверкомы выяўляюць пры дапамозе партыйцаў, беспартыйных рабочых, работніц і служачых. Можна сьмела зрабіць вывад, што чыстка праходзіць на аснове разгорнутай самакрытыкі і бязьлітасна выкрывае тэорыю і практыку правага апартунізму.

Аднак, трэба адзначыць, што ў Менску ў радзе ячэек (ячэйка працасьветы) асобныя камуністыя плятуцца ў хвасьце, ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў чыстцы. Гэтыя партыйцы баяцца выступаць з крытыкай. пасыўна чакаюць сваёй чаргі, каб прайсьці чыстку.

ЦКК падагуліла вынікі чысткі па 62 савецкіх ячэйках КП(б)Б. Гэтыя вынікі паказваюць, што сярэдні процант выключэньняў па савецкіх ячэйках **ніжэйшы,** чым па вясковых ячэйках. Процант выключэньняў па вясковых ячэйках складае 14,2, а суровыя спагнаньні—13,9: па савецкіх-жа ячэйках **з 1.444 праверяных выключана 137** чалавек (9,4 проц.) і вынесена спагнаньняў—171 (11 проц.).

Галоўнымі прычынамі выключэньня зьяўляецца сувязь з чужым элемэнтам, службовыя і крымінальныя злачынствы і п'яньства.

У заключэньне трэба адзначыць некаторыя памылкі ў практыцы асобных парверкомаў.

Некаторыя праверкамісіі не змаглі разгарнуць самакрытыкі на сходах і абудзіць актыўнасьць мас, а таксама дапусьцілі памылкі ў сваёй рабоце.

Так, напрыклад, праверком, які праводзіў чыстку ячэйкі Бабруйскага ЦРК, паварэчыў падышоў ка праверкі членаў ячэйкі. Выкрываючыя матар'ялы не правяраліся. У выніку праверком выключыў аднаго таварыша па беспадстаўных, не праверяных матар'ялах.

ЦКК зьвярнула ўвагу Бабруйскай АКК на патрэбнасьць тэрмінова выправіць памылкі гэтага праверкому.

Ячэйка КП(б)Б мэдфаку БДУ на праверцы

Тры дні абмяркоўвалася справаздача сакратара ячэйкі КП(б)Б мэдфаку. Выказалася каля 50 чалавек, з якіх большая частка партыйцы і камсамольцы. Сярод беспартыйных выказаліся чатыры прафэсары.

Студэнты адзначылі, што партыйная арганізацыя на факультэце адарвана ад беспартыйнага студэнцтва. Парт'ячэйка слабую работу праводзіла сярод беспартыйных, ня ўцягвала іх у актыўную грамадзкую работу на факультэце. Большая частка партыйных сходаў былі зачыненыя, і толькі ў апошні час перад чысткай было некалькі адкрытых сходаў.

Бюракратызм у дэканаце мэдфаку

Беспартыйны студэнт **Пэўзнэр** сказаў, што «каб зайсьці ў дэканат і пагаварыць з намесьнікам дэкана т. **Башкевічам,** трэба стаць на фронт». Наглядаюцца грубыя адносіны з боку т. Башкевіча да студэнцтва, не жадальне выслухаць да канца і даць належны адказ. Гэтыя хваравітыя зьявішчы, гэты бюракратызм з боку партыйца, працаўніка дэканату, як відаць, узбуджаражыў ўсю студэнцкую масу факультэту, бо калі студэнт Пэўзнэр выказаў такую думку, яна была падтрымана воплескамі.

Прымірэнцтва на практыцы

Тав. Башкевіч, кажа т. **Шульц,** зусім не рэагаваў, а прымірэнча адносіўся да тых ідэалёгічна варожых пралетарыяту выступленьняў, якія наглядаліся з боку часткі рэакцыйнай прафэсуры. Так, напрыклад, некаторыя прафэсарамі выказваюцца такія антысавецкія думкі. У часе лекцыі пры досьледах разьбіваецца прабірка і прафэсар залуўле: «савецкая вытворчасьць». Выкладаючы студэнтам ваенную гігіену, тлумачыць: «Нетрудовой элемент не берут в Красную армию потому, что он физически слабее рабочих и трудового крестьянства». Лепшым падручнікам па вырачэньні агульнай гігіены раіцца Талмуд.

Але партыйная частка дэканату на такія зьявішчы зусім не рэагавала і замест таго, каб завастрыць пытаньне на ідэалёгічнай барацьбе на факультэце, т. Башкевіч на перавыбарчым сходзе дэканату і прадметных камісій займаўся беспрынцыповым дзяляцтвам, дробязямі канцылярскай работы.

Аб беларусізацыі

Хаця сакратар ячэйкі **т. Олікер** у сваёй справаздачы і сказаў, што беларусізацыя на мэдфаку пастаўлена вдавальняюча, але-ж, як відаць, гэта ня зусім так. Сам сакратар рабіў справаздачу на расійскай мове, вялікая колькасьць як партыйцаў, так і беспартыйнага студэнцтва, а таксама навуковыя працаўнікі выказваліся на расійскай мове. Выступаючыя таварышы адзначалі, што белмова ня ўжываецца партыйцамі ў штодзённым жыцьці, што частка партыйцаў ужывае белмову толькі на ўрачыстых пасяджэньнях.

Аб кадрах

Ячэйка мала зварачала ўвагі на пытаньні падрыхтоўкі кадраў. Малодныя навуковыя працаўнікі асьпіранты і ардынатары-партыйцы працуюць у дрэнных умовах, часта перагружаны грамадзкай працай і ня могуць займацца сваёй навуковай работай па спэцыяльнасьці. Яшчэ ў мінулым годзе былі высунуты вылучэнцы студэнты, але-ж яны нічога не рабілі і сярод іх ніякай работы не вялося. У гэтым годзе таксама пытаньне з вылучэнцамі цягнецца, абгаворваецца, а толку мала.

Аб самакрытыцы

Таварыш Дракін адзначыў, што самакрытыка на факультэце разгорнута на 100 проц. За гэты алтымізм яму вельмі дасталося. Самакрытыка яшчэ ня стала мэтадам усёй працы на факультэце. Такім быў адказ тав. Дракіну з боку выступаючых. Крытыка на факультэце была бязьзубая, крытыкавалі паджэнтльмэнску. Выключна крытыка была зьверху, ня сустрэўшы моцную хвалю самакрытыкі зьнізу. Рэдкалегія «Мэдфакаўца» ня памятае выпадку, калі-б радавы партыец рэагаваў праз насьценгазэту на маючыя месца хваравітыя зьявішчы на факультэце.

Грамадзкія дысцыпліны не ў пашане

Дрэнна былі пастаўлены грамадзкія дысцыпліны на факультэце. На гэтыя дысцыпліны ня зьвернута ўвагі як з боку дэканату, так і партыйнай арганізацыі на факультэце. Няма належнага, стабільнага памяшканьня для заняткаў і былі выпадкі, калі студэнты прымушаны былі перанесьці выкладаньне дыялектыкі ў мэдыцыне на прыватную кватэру да студэнта.

Багач М., Крэйнін В.

Справаздача аб сходах ячэйкі КП(б)Б НАРКАМАСЬВЕТЫ, на якіх праходзіла чыстка членаў ячэйкі, будзе зьмешчана ў заўтрашнім нумары

Самаправерка ў Асоавіяхіме

Кампанія праходзіць марудным тэмпам

У ячэйках яшчэ зусім не разгарнулася сацспаборніцтва і самакрытыка

Патрэбен рашучы перапом у гэтай рабоце, узмацненьне жывога кіраўніцтва ёю

Чарапашыным крокам

Самаправерка работы Асоавіяхіму толькі тады дасьць патрэбныя вынікі, калі наўкола яе будзе згрупавана ўвага мас. На жаль, гэта важнейшая задача ў нас выконваецца вельмі слаба. Зусім відавочна, што ў большасьці арганізацый яшчэ ня створаны ўмовы для разгортваньня шырокай самакрытыкі, для арганізацыі сацспаборніцтва, якія павінны былі стаць асноўным сродкам праверкі і паляпшэньня работы. Прычыну тут, перш за ўсё трэба шукаць у слабым кіраўніцтве самаправеркай, у навыстарчальным уліку кіруючымі органамі, што робіцца ўнізе. І гэты недахоп можна знайсьці ўсюды, пачынаючы з ЦС Асоавіяхіму. Дырэктывы даны ўсюды дасканалыя, але вы нідзе ня будзеце ведаць, як яны выконваюцца. Ня гледзячы на тое, што прайшло ўжо больш месяца з дня абвяшчэньня самаправеркі, а ў ЦС няма ніякіх даных аб яе ходзе. Ня было выпадку пасылкі на месцы работнікаў ЦС, жывога кіраўніцтва, дапамогі ў рабоце.

Такія мэтады работы пастарэлі ўжо, нікуды нязвартыя. Адсюль і тыя мізэрныя вынікі, якія мы маем. Ужо даволі пісаў «Рабочий» аб стане справы ў Менскай акрузе. «Чырвоная Полаччына» нядаўна ўстанавіла бязьдзейнасьць Полацкага акрсавету, дзе большасьць членаў прэзыдыуму практычнай работы не вядзе. У цэнтральным савеце нам таксама нічога не змаглі паведаміць аб канкрэтных выніках самаправеркі, бо такіх вынікаў яшчэ ня было падведзена.

А што зроблена самім ЦС у парадку самаправеркі? Амаль што нічога. Ці абгаворвалі сэкцыі сваю работу, ці намецілі яны парадак агляду сваёй работы? Не. Цэнтральны Савет вызначыў праверку работы Менскае акругі. Гэта добра. Але не пашкодзіла-б паглядзець і на сваю работу, наколькі абвешчана самаправерка.

Ня прыняты меры да разгортваньня крытыкі работы ЦС з боку ніжэйшых органаў.

Словам, кампанія самаправеркі ідзе надзвычай вяла, без элемэнтаў сацспаборніцтва, без належнага ўліку работы і жывога штодзённага кіраўніцтва ёю. Патрэбен рад неадкладных мер па ажыўленьні работы, інакш зіма нас застане непадрыхтаванымі.

Асоавіяхімавец.

Пытаньне аб сацыялістычным **спаборніцтве** *павінна быць галоўнейшым ва ўсёй рабоце Асоавіяхіму.*

Другі момант—гэта пытаньне **самакрытыкі.** *Тут мы да гэтага часу блытаемся ў хвасьце. Самакрытыку мы павінны няўхільна праводзіць у штодзённай рабоце асоавіяхімаўскіх арганізацый.*

Мы павінны падняць нашу грамадзкасьць. Кожны член таварыства павінен усьвядоміць, што без **сацыялістычнай дысцыпліны** *мы далёка ня пойдзем.*

Уншліхт.

Пара прачнуцца

На Аршаншчыне перш за ўсіх пачалася самаправерка ў **Капыскім раёне.** Там за справу ўзяліся зараз-жа, як толькі атрымалі плян і ўказаньні ад акрсавету. Некаторыя райсаветы, як напрыклад, **Дубровенскі, Мсьціслаўскі, Аршанскі** да самаправеркі яшчэ зусім не прыступалі. **Райсаветы Крупскага, Аршанскага, Чарэйскага і Круглянскага раёнаў** за апошнія часы не праводзілі ніякай работы. Яны спалі. Таксама спалі і ў горадзе **ячэйкі судова-сьледчых устаноў і мэталістых.** З прычыны гэтага памянёныя райсаветы і ячэйкі пакуль што не пачыналі і самаправерку, бо няма з чым яе рабіць. Яны цяпер імкнуцца што-небудзь зрабіць, а пасьля ўжо ўступіць у самаправерку: усё-ж такі будзе што-небудзь зроблена.

МІЛАШЭЎСКІ.

Ваенная работа не ў пашане

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Работа па вайнізацыі насельніцтва па Барысаўскім раёне кульгае. Работа саміх кіруючых органаў Асоавіяхіму пастаўлена таксама кепска.

Гурткі пры ячэйках Асоавіяхіму амаль не працуюць, заняткі не праводзяцца. Ціры, якія ёсьць у Барысаве і Нова-Барысаве, пустуюць і нягодны для заняткаў. Сабраныя сродкі ў фонд абароны краіны па горадзе да гэтага часу не перасланы на прыналежнасьці. Лепш справа з вясковай арганізацыяй, апошняя ўсе сабраныя сродкі ўнесла і яны пераведзены ўжо па прыналежнасьці. Нізавыя парт. і праф. арганізацыі вельмі мала цікавяцца работай Асоавіяхіму. Старшыня раённага савету Асоавіяхіму лічыцца толькі на паперы і нічога ня робіць.

За сельскія саветы Асоавіяхіму

(у парадку прапановы)

У сучасны момант, калі ў парадку працы стаіць пытаньне, каб на працягу зімняга пэрыяду ў кожнай вёсцы раёну была ячэйка Асоавіяхіму, трэба нам падумаць аб арганізацыйнай структуры нашай вясковай работы. Для таго, каб праца вясковых ячэек была не на паперы, а на фактах, трэба арганізаваць сельскія саветы Асоавіяхіму. Дзякуючы росту ячэек, **аднаму райсавету з працай ня справіцца.** Кіраўніцтвам ахапіць усе ячэйкі ён ня зможа. Арганізацыя сельсаветаў дазволіць разгарнуць працу больш шпаркім тэмпам як у сэнсе вярбоўкі новых членаў, так і арганізацыі стралковых і вайсковых гурткоў. Можна будзе пры кожным сельсавеце пабудаваць цір для стралковых заняткаў, чаго мы ня можам зрабіць у сучасны момант. Усё гэта гаворыць за тое, што нам трэба хутчэй пераарганізаваць пункт статуту і прыс[illegible] сельсаветаў.

Бондар.

Такіх трэба заахвочваць

Працаўнік калгасу «Сіла» з Мазыршчыны САВІЧ Мікола Сазонтаў актыўна паказаў сябе ў справе ўзмацненьня абароны краіны. У цёмным кутку Мазыршчыны ён арганізаваў з трох калгасаў яячэйку Асоавіяхіму ў 150 чалавек, арганізаваў вайсковы і санітарны гурткі, купіў вінтоўкі, процігазы і літаратуру і пачаў заняткі з калгасьнікамі. Актыўна адгукнуўся на выклік пабудовы танку, сабраў ужо 50 руб. Грошы паслаў у акрсавет Асоавіяхіму.

Мы ахвотна ідзем насустрач ініцыятыве т. Савіча і дружна ўзяліся за вайсковую вучобу і даем абяцаньне, што навучымся ўладаць вінтоўкаю і ва ўсялякі час зможам стаць на абарону нашай дарагой Савецкай улады.

ГРУПА ЯЧЭЙКІ АСОАВІЯХІМУ

Няма плянаў работы

(М. Капыль, Менскае акругі)

Надыходзіць зімні пэрыяд, а да гэтага часу райсаветы яшчэ не атрымалі ад **Менскага** акр. савету Асоавіяхіму арыентовачных плянаў працы. Такім чынам, райсаветы павінны самі іх складаць і праводзіць у жыцьцё. Але праз некаторы час, як гэта наглядалася вясною бягучага году, акр. савет прышле свой плян з прапановай увязаць яго з свой плян з прапановай увязаць яго з райсаветаўскім плянам. Такое кіраўніцтва ня можа лічыцца добрым, бо парушае на мясцох самы тэмп працы і не дае магчымасьці сваячасова гэты плян разаслаць па вясковых ячэйках. Гэта ў сваю чаргу прыводзіць да таго, што нашы добра складзеныя пляны або ня выконваюцца зусім, або з спазьненьнем на 2-3 месяцы.

Б.

Навучым грамаце батрака

Усім АВК, акрана, АК ЛКСМБ і акругкомам саюзу СГРЛ

У мэтах узмацненьня пралетарскага ўплыву і арганізуючай ролі сельгаслесрабочых у сацыялістычным будаўніцтве на вёсцы, у мэтах забесьпячэньня яшчэ большага прыцёку сельгаслесрабочых у рады кампартыі, камсамолу і прафсаюзу, нам трэба наладзіць справу клясавага выхаваньня шырокіх мас батрацтва. Самаю асноўнаю перашкодаю ў гэтай справе зьяўляецца няпісьменнасьць і малапісьменнасьць вясковых пралетараў. Таму асноўнаю задачаю ў справе ўцягненьня сельгаслесрабочых у актыўнае гаспадарчае і культурнае будаўніцтва на вёсцы зьяўляецца зьнішчэньне няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод шырокіх мас батрацтва і ўвязка гэтае работы са справаю клясавага выхаваньня сельгаслесрабочых. На 29-30 на вучальны год намечана ліквідаваць няпісьменнасьць і малапісьменнасьць сярод 50.000 сельгаслесрабочых.

Для выкананьня гэтае задачы паміж саюзам сельгаслесрабочых і НК Асьветы заключана ўмова, згодна якое НКАсьветы, пры матар'яльнай дапамозе саюзу абавязваецца на працягу навучальнага году навучыць 50.000 няпісьменных і 4.300 малапісьменных. Для чаго патрэбна арганізаваць каля 3000 спэцыяльных батрацкіх лікпунктаў і каля 1000 груп малапісьменных.

У сувязі з гэтым арганізацыйны аддзел прэзыдыуму ЦВК, Наркамасьветы, ЦК ЛКСМБ і ЦП сельгасрабочых прапануюць:

1) Для арганізацыі работы па зьнішчэньні няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод сельгаслесрабочых і садзейнічаньня ў гэтай рабоце пры сельсаветах арганізаваць камісіі з прадстаўнікоў сельсавету, сельрабкому, яч. ЛКСМ і настаўніка. Старшынёю камісіі зьяўляецца старшыня або сакратар сельсавету.

2) На камісіі ўскладаецца работа па правядзеньні падліку няпісьменных і малапісьменных батракоў, батрачак і сельгаслесрабочых, арганізацыі лікпунктаў і груп, разьмеркаваньні няпісьменных і малапісьменных па лікпунктах, арганізацыі індывідуальнага навучаньня батракоў, нагляд за работаю лікпунктаў, арганізацыя выпуску з лікпунктаў і падвядзеньне вынікаў гэтае работы.

3) Улік няпісьменных і малапісьменных праводзіцца па спэцыяльна распраўданай вучотнай картцы. Запоўненыя вучотныя карткі няпісьменных і малапісьменных батракоў і сельгаслесрабочых перадаюцца настаўніку таго лікпункту або групы, да якое прымацаваны няпісьменны або малапісьменны.

4) Усю тэхнічную работу па вучоце няпісьменных і малапісьменных сельгаслесрабочых і па складаньні сьпісаў праводзяць ячэйкі камсамолу ў парадку дапамогі прафсаюзу СГЛР.

5) Настаўнік лікпункту, атрымаўшы карткі няпісьменных і малапісьменных, прымацаваных да яго лікпункту, разам з сельрабкомам арганізоўвае работу лікпункту і на картках адзначае наведваньне лікпункту і пасьпяховасьць навучаемага.

6) Камісія па зьнішчэньні няпісьменнасьці сярод батрацтва працуе на працягу ўсяго навучальнага году, правярае работу лікпунктаў, вывучае прычыны ненаведваньня лікпункту, непасьпяховасьць навучаемых і прымае меры да ўхіленьня гэтых прычын. У выпадках, калі наймальнікі ня будуць пушчаць батракоў на лікпункты, камісія пры сельсавеце прымае належныя меры ўзьдзейнічаньня на наймальнікаў.

7) У канцы навучальнага году камісія арганізоўвае выпуск няпісьменных і малапісьменных з лікпунктаў і падводзіць вынікі ўсёй работы. Сельгаслесрабочым, скончыўшым лікпункты, выдаецца адпаведнае пасьведчаньне.

8) Лікпункты і групы праводзяць работу на бедмове, а там, дзе ёсьць сельгаслесрабочыя другіх нацыянальнасьцяй (яўрэйская, польская і інш.), лікпункты працуюць на іх роднай мове.

9) Акрана, АК ЛКСМБ і акругкомы саюзу абавязаны сыстэматычна правяраць выкананьне гэтых дырэктыў і агул пастаноўку работы па зьнішчэньні няпісьменнасьці сярод сельгаслесрабочых шляхам абсьледваньняў і заслуховаўваньня дакладаў аб рабоце сваіх нізавых арганізацый.

Арганізацыйны аддзел прэзыдыуму ЦВК, НК Асьветы, ЦК ЛКСМБ і ЦП сельгаслесрабочых упэўнены, што важнейшая задача зьнішчэньня няпісьменнасьці сярод вясковага пралетарыяту будзе выканана.

Заг. аргаддзелу прэзыдыуму ЦВК БССР **Л. Лукашэвіч.**
Наркамасьветы БССР **Платун.**
Старшыня ЦП СГЛР **Вайтэнкаў**
Сакратар ЦК ЛКСМБ **Галавач.**

Перавыбары дэлегатак

Выкарыстаем перавыбары дэлегатак для ўцягненьня соцень тысяч працоўных жанчын у гіганцкую работу па сацыялістычнай рэканструкцыі гаспадаркі

Лепшых перадавых работніц, батрачак, калгасьніц і бяднячак— у рады КП(б)Б

У БАРАЦЬБЕ ЗА НОВУЮ КАЛЕКТЫВІЗАВАНУЮ ВЁСКУ

Як прайшла перавыбарчая кампанія дэлегатак па Чэрвеньшчыне

(АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Скончылася справаздачна - перавыбарчая кампанія дэлегатак на Чэрвеньскім раёне. Кампанія прайшла пад знакам мабілізацыі мас працоўных жанчын вакол задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Падрыхтоўчая работа да перавыбараў пачалася в шырокай нарады сакратароў ячэек, сельскіх жанарганізатараў і кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў, на якой быў распрацаваны канкрэтны плян правядзеньня кампаніі. Пасьля гэтага па ўсім раёне праводзіліся сельскія жаночыя канфэрэнцыі. На апошніх, акрамя пытаньня аб перавыбарах, стаялі таксама даклады аб рабоце сельсаветаў, КСУ, каапэрацыі.

Дрэнным выключэньнем зьявіліся **Лядзенскі і Раваніцкі** сельсаветы, дзе жаночыя канфэрэнцыі ня былі скліканы і дзе да перавыбарчай кампаніі наогул падыйшлі фармальна. Ячэйкі КП(б)Б гэтых сельсаветаў нічога не зрабілі для перавыбараў дэлегацкіх сходаў — яны лічаць гэта справай выключна жанарганізатараў.

29-га верасьня ў Чэрвені адбылася раённая канфэрэнцыя батрачак, бяднячак, саўгасьніц, калгасьніц і актыву сераднячак. Канфэрэнцыя намецела рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні тэмпу калектывізацыі на раёне, дапамозе сельсаветам у выкрыцьці кулацкіх гаспадарак і правядзеньні самаабкладаньня і г. д.

Калгасны рух сярод батрачак і бяднячак расьце. У пасёлку **Хвазні** па ініцыятыве батрачак і бяднячак арганізуецца калектыўная гаспадарка, у вёсцы **Клінак** жанчыны таксама прыступілі да арганізацыі калгасу. Дэлегаткі праводзяць экскурсіі жанчын у прыкладныя калектыўныя гаспадаркі. Энтузіязм жанчын да арганізацыі калгасаў вельмі вялікі.

На 4-х сельскіх канфэрэнцыях былі ўхвалены пастановы аб самаабкладаньні на арганізацыю дзіцячых ясьляй у разьмеры 10-ці процантаў. У **Рудзенскім і Раваніцкім** сельсаветах жанчыны зьбіраюць сродкі для арганізацыі кас самастрахаваньня сялянак.

Вялікую ўвагу жаночыя канфэрэнцыі зьвярнулі на хлебазагатоўкі. Разгорнутая РК КП(б)Б шырокая растлумачальная работа сярод жанчын аб значэньні хлабазагатовак дала асноўныя вынікі. Бяднячкі і сераднячка актыўна падтрымліваюць здачу хлеба каапэрацыі і прымаюць удзел у арганізацыі чырвоных абозаў. На сходах жанчыны патрабавалі больш рашучых мер супроць кулакоў, якія спэкулююць хлебам і адмаўляюцца здаць яго ў каапэрацыю. Адначасова батрачкі і бяднячкі патрабавалі рашучай барацьбы з кулацкай эксплёатацыяй. У выступленьнях батрачкі прывялі рад канкрэтных фактаў эксплёатацыі і зьдзекаў над імі з боку кулакоў і заможнікаў.

Варожа-кулацкая частка насельніцтва імкнулася дыскрэдытаваць сыстэму дэлегацкіх сходаў і перашкодзіць справаздачна - перавыбарчай кампаніі. У вёсцы Вялікапольле кулачкі сыстэматычна агітавалі сярод сераднячак супроць дэлегацкіх сходаў. У выніку перавыбарчы сход быў сарваны з-за няяўкі большасьці сераднячак. Аналёгічныя выпадкі агітацыі сярод сераднячак былі і ў іншых вёсках.

У гэтым годзе лік дэлегацкіх сходаў па раёне павялічаны да 12, супроць 8-мі ў мінулым годзе; усяго на раёне выбрана 346 дэлегатак (у мінулым годзе было 227). Дэлегацкімі сходамі ахоплены 4 саўгасы, 5 калгасаў, 1 камуна і 12 вёсак і пасёлкаў. Кандыдатуры дэлегатак наперад абгаворваліся ячэйкамі КП(б)Б, жаночым актывам і, у некаторых пунктах, на сходах і групах бедноты. Новыя дэлегацкія сходы прыступілі да работы.

С.

Навучаныя горкай практыкай

(Лямцавая і вяровачная фабрыкі, Менск)

Работніцы і жонкі рабочых лямцавай і вяровачнай фабрык навучаны горкай практыкай. У мінулым годзе яны выбралі 8 дэлегатак, але праз некаторы час 4 з іх зусім адсеялася, а з рэшты толькі 1 акуратна наведвала дэлегацкія сходы. Амаль усе дэлегаткі, такім чынам, аказаліся непрацаздольнымі, незацікаўленымі ў рабоце. Гэта было вышкам няўважлівага падбору кандыдатур і неахайных адносін да перавыбараў дэлегатак з боку фабрычных арганізацый.

У гэтым годзе да перавыбараў падрыхтаваліся некалькі лепш. Сярод рабочых, работніц і жонак рабочых была праведзена растлумачальная работа аб значэньні перавыбарчай кампаніі. Кандыдатуры дэлегатак былі абмеркаваны ячэйкай і жаночым актывам. На перавыбарчым сходзе прысутнічала 100 чалавек. На гэты раз дэлегаткамі выбрана 13 актыўных, працаздольных таварышоў.

Н.

На новых рэйках

(Ячэйка КП(б)Б пры саюзе нархарч)

Нядаўна скончыліся перавыбары дэлегатак па саюзе нархарч. Дэлегацкі сход мінулага складу працаваў невыстарчальна. Асноўным недахватам была слабая масавая работа сярод дэлегатак, адсутнасьць палітычнага выхаваньня. Гурткі, што працавалі пры сходзе, зьбіраліся рэдка. Насьценгазэты выпускаліся толькі ад выпадку да выпадку, прысьвечаныя тэй ці іншай кампаніі. Справаздачы дэлегатак не заслухоўваліся на рабочых сходах.

Слабая работа мінулага дэлегацкага сходу паказала на практыцы, што ўсё залежыць ад падбору кандыдатур, ад удалага правядзеньня перавыбараў. Таму на гэты раз арганізацыі больш актыўна аднесьліся да перавыбарчай кампаніі. Кандыдатуры дэлегатак былі дэтальна абгаворваны партыйнай ячэйкай і актывам работніц. Для правядзеньня перавыбарчых сходаў, ячэйкай былі вылучаны партыйцы, аўтарытэтныя таварышы. Усяго праведзена 6 сходаў, выбрана 125 дэлегатак. Сходы праходзілі актыўна, пад знакам шырокага ўцягненьня працоўных жанчын у штодзённае сацыялістычнае будаўніцтва. Трэба спадзявацца, што выбраныя дэлегаткі цалкам сябе апраўдаюць.

Л.

НІ АДНАГО ПАРТЫЙЦА БЕЗ „ЗЬВЯЗДЫ"

У мінулым годзе («Зьвязда» № 2911) адзначалася, што справа папулярызацыі і распаўсюджаньня «Зьвязды» ў рабочых раёнах—Залінейным, Новабеліцкім, на фабрыках—«Дняпро-Кастрычнік», у галоўных чыгуначных майстэрнях і г. д. пастаўлена вельмі дрэнна.

Здавалася-б, што партыйныя арганізацыі, якіх гэта датычылася, зараз-жа паправяць справу, прымуць рад рэальных мерапрыемстваў для паляпшэньня работы ў галіне папулярызацыі і распаўсюджаньня «Зьвязды».

Але прайшоў 28 год і верасень 29 году, а між тым работа па прасоўваньні «Зьвязды» ў масы працоўных заставалася ўсё яшчэ не распачатай і ня было тых падстаў, якія-б гаварылі за тое, што гэтыя і іншыя партарганізацыі (якіх гэта датычылася) па гэтай справе штосьці ды зрабілі. Так, Новабеліцкая савячэйка ня выпісвае ніводнага экзэмпляра «Зьвязды», на фабрыцы «Вэзэві» на 1.600 рабочых—18 экз., Новабеліцкая раённая арганізацыя ў цэлым на 500 партыйцаў, ня лічачы вялікай колькасьці беспартыйных рабочых,—78 экз., «Дняпро-Кастрычнік» (Рэчыца) на 2.500 рабочых—13 экз., у галоўных чыгуначных майстэрнях на 1.480 рабочых—15 экз., на кастрычнік месяц—73 экз., «Камінтэрн» на 825 рабочых—1 экз., на кастрычнік—10 экз., у ячэйцы Палеспруку—1 экз. да і то ячэйка ніяк ня можа знайсьці таварыша, які адважыўся выпісаць «Зьвязду».

Гэтыя паказаньні яшчэ раз падкрэсьліваюць, што ні райпартарганізацыі (куды ўваходзяць гэтыя прадпрыемствы), ні самі ячэйкі ня толькі што нічога не рабілі, а і зусім ня цікавіліся справай прасоўваньня ў партыйныя масы органу ЦК КП(б)Б «Зьвязды».

На сёпешні-ж дзень работа па распаўсюджаньні «Зьвязды» ў памянёных райпартарганізацыях у цэлым пасунулася ўперад (палепшылася). Райпартарганізацыі ўступілі ў спаборніцтва па падпісцы на «Зьвязду» і прынялі рад мерапрыемстваў для паляпшэньня гэтае працы. Між тым трэба заўважыць, што значная частка ячэек (гэтых раёнаў), а асабліва вышэйпамянёныя ніяк не адважваюцца распачаць работу—надта яна здаецца ім цяжкой, але яна і в нялёгкіх. У частцы гэтых ячэек імкнуцца тлумачыць немагчымасьць павялічэньня падпіскі на «Зьвязду» тым, што на прадпрыемствах ня ведаюць белмовы («Дняпро-Кастрычнік», «Праца», «Камінтэрн» і інш.), як відаць, у гэтых ячэйках і ў справе беларусізацыі таксама зусім нічога не рабілася і ня робіцца.

Справа ня ў мове, а справа ў тым, што трэба шырока разгарнуць растлумачальную работу аб значэньні і ролі «Зьвязды», давесьці кожнаму, колькі практычнае карысьці атрымлівае кожны яе чытач, тады ў вас будуць чытаць «Зьвязду», адначасова вывучаць белмову і выканаеце лёзунг «Няма ні аднаго партыйца, які-б ня выпісваў «Зьвязды».

ПАРХІМЧЫК.

Як ідзе спаборніцтва па падпісцы на „Зьвязду"

ПУХАВІЦКАЯ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ВЫКЛІКАЕ НА СПАБОРНІЦТВА БАРЫСАЎСКУЮ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЮ

Нарада сакратароў ячэек КП(б)Б Пухавіцкага раёну сумесна з раённым партактывам, абгаварыўшы пытаньне аб пашырэньні падпіскі на газ. «Зьвязда», пастанавіла: «Дабіцца

53 ПРОЦ. ЗЯМЕЛЬНАЙ ПЛОШЧЫ КЛІМАЎШЧЫНЫ ЗАНЯТЫ КАЛЕКТЫВАМІ

КЛІМАВІЦКІ РАЕН ЧАКАЕ: агранамаў, кіраўнікоў калгасаў, асьветнікаў, трактароў і сельска-гаспадарчых машын

Справу дапамогі Клімаўшчыне зрушым з мёртвага пункту

Пазаўчора ўвечары адбылося пасяджэнне праўленьня Белкалгассаюзу з удзелам прадстаўнікоў каапэрацыйных цэнтраў і раду зацікаўленых установ па пытаньні аб дапамозе Клімавіцкаму раёну суцэльнай калектывізацыі.

На гэтым сходзе ўпяршыню канкрэтна ставілася пытаньне, што трэба зрабіць, каб замацаваць дасягненьні, якія ўжо ёсьць у галіне калектывізацыі ў Клімаўшчыне і з гэткім-жа тэмпам рухацца ўперад.

Вялікую зацікаўленасьць выклікаў даклад аб выніках абсьледваньня Клімаўшчыны спэцыяльнай камісіяй Магілеўскай акругі і інструктарам Белкалгассаюзу т. **Цынковым.** Гэта камісія працавала ў Клімаўшчыне на працягу паўтара месяца і сабрала вялікі матар'ял, які характарызуе прыродна - гістарычныя і эканамічныя ўмовы раёну.

53 проц. зямельнае плошчы калектывізаваны

Як паведаміў у сваім дакладзе т. Цынкоў, па 27-X у Клімаўшчыне калектывізавана **50 тысяч гэкт. зямельнае плошчы, або 53 проц. агульнай плошчы раёну.** Спрэдні разьмер арганізаваных сёлета калгасаў дасягае 1.500 гэкт. Няма ні аднаго сельсавету, дзе ня быў-бы арганізаваны калгас. 7 сельсаветаў калектывізаваны ад 80 да 100 проц. Калектывізацыя ідзе такім шпаркім тэмпам, што да вясны г. г. аграмаджаньне зямлякарыстаньня ў Клімаўшчыне дойдзе да 75 проц.

Даклад выклікаў ажыўленыя спрэчкі з боку прысутных прадстаўнікоў цэнтральных арганізацый. Амаль усе адзначалі, што **да гэтага часу мы нічым практычна не дапамаглі Клімавіцкаму раёну суцэльнай калектывізацыі і што цэнтральныя установы не зварачалі ўвагі на апошні.**

Як мы дасягнулі такіх вынікаў

Вялікае ўражаньне зрабіла выступленьне сакратара Клімавіцкага райкому партыі тав. **Сосніна,** які расказаў аб мэтадах працы ў гэтым раёне, якія далі вялікарныя вынікі, і аб тых перашкодах, якія раён сустракае на шляху сваёй далейшай калектывізацыі.

— Тут ужо называлі лічбы, якія сьведчаць аб нашых посьпехах у галіне калектывізацыі Клімавіцкага раёну. Я толькі адзначу, што ў працягу аднаго году мы арганізавалі калгасы, якія маюць плошчу ў 8 тысяч, 7 тысяч, 6 тысяч, 2 тысячы гэкт. Ёсьць і шмат больш дробных.

Як мы дасягнулі гэтага? Мы не напіралі на пашырэньне калектывізацыі ў адным пэўным сельсавеце. Наадварот, мы пачалі ахапляць калектывізацыяй розныя месцы ў нашым раёне. Спачатку мы паставілі перад сабою задачу — у раёне двейнасьці кожнай ячэйкі павінен быць адзін калгас. Калі мы гэтага дабіліся, мы высунулі наступную задачу — ня менш аднаго калгасу трэба арганізаваць у кожным сельсавеце. Мы і гэтага дасягнулі. Тады наступіла чарга і за суцэльнай калектывізацыяй. У кароткі тэрмін наш малады калгас «Ленінскі шлях» зрабіўся прыкладным. Цяпер мы пасылаем туды тых, хто ня верыць або сумняваецца ў выгоднасьці калектыўнай формы землякарыстаньня. З калгасу «Ленінскі шлях» такія людзі варочаюцца з новымі думкамі. «Ленінскі шлях» стаў прыкладам, ня гледячы на тое, што мае толькі адзін трактар. Жаданьне перамагчы, вера ў ідэю калектывізацыі зрабіла оваё. Там ужо абагулены жывёла, пасевы. Там калгас паказаў ужо сваім членам эфэктыўнасьць калектывізацыі. Пры падзеле ўраджаю, беднякі атрымалі каштоўнасьцяй на 70 проц. больш, чым мелі раней, сераднякі на 10-20 проц. Толькі некалькі кулакоў атрымалі менш каштоўнасьцяй, чым яны мелі раней у сваіх уласных гаспадарках.

Але мы ня можам ісьці далей, не замацаваўшы таго, чаго дасягнулі. Нам не хапае практычнага кіраўніцтва з Менску, нам не хапае вашай дапамогі людзьмі і сродкамі вытворчасьці. Мы не жадаем замаруджваць тэмп калектывізацыі ў нашым раёне, але ня можам яго працягваць, калі Клімавіцкаму раёну з вашага боку ня будзе зьвернута належная ўвага. Гэта-ж сьмеху варта, калі такі вялізарны калгас, як «Камунар» Магілеўшчыны (8.000 гэкт.) ня мае піводнага трактара, ніводнай машыны.

Мы патрабуем ад вас прыняцьця рашучых надзвычайных мер. Дайце трактары, машыны, людзей.

Трэба перагледзець усе пляны прамысловага і каапэрацыйнага будаўніцтва, каб удзяліць Клімавіцкаму раёну, як мага больш увагі.

Справа за дапамогай цэнтру

Ня меншы ўплыў зрабіла выступленьне старшыні Магілеўскага акрвыканкому тав. **Малашонка.**

— Я ня прыехаў, а прыляцеў у Менск, сказаў тав. Малашонак. — Нашск раду раёнаў на акругу, патрабаваньні дапамагчы ў галіне калектывізацыі настолькі вялікія, што я, як кіраўнік акругі, ужо нічога зрабіць ня ў сілах. **У вёсках Магілеўшчыны адбываецца зараз такая рэвалюцыя, якая ламае ўсе старыя ўклады жыцьця, увесь стары быт.** У нашай вёсцы кіпіць, як у катле. **Усюды толькі адна гутарка аб калектывізацыі.** Па тры ночы ў сялянскіх хатах ня тухне агонь, усюды клюбы, усюды сходы — усе абмяркоўваюць справу калектывізацыі.

Унесьці гэты рух у плянавыя рамкі, ажыцьцявіць суцэльную калектывізацыю можна толькі пры ўмове, калі цэнтр дапаможа нам ня толькі абежнікамі, але справай. **40 трактараў, якія вызначаюцца Клімаўшчыне, мала.** Акрамя таго, нельга абмежавацца толькі трактарамі, патрэбны і сельска-гаспадарчыя машыны. А гэта высоўвае пытаньне аб рэарганізацыі беларускіх заводаў сельска-гаспадарчых прылад. Неабходна, каб яны пачалі выпрацоўваць патрэбныя нам складаныя машыны. Трэба выдзеліць належныя сродкі на арганізацыю курсаў гаспадарнікаў з саміх калгасьнікаў.

Што трэба зараз-жа зрабіць

Усе прысутныя на пасяджэньні праўленьня Белкалгассаюзу сышліся на тым, што ў першую чаргу трэба Клімавіцкі раён забясьпечыць неабходнымі кіраўнікамі партыйцамі і арганамамі. Частку працаўнікоў павінен выдзеліць Менск, а частку — Магілеў. Для ўзьдваленьня першых патрэб раёну досыць 7-10 агранамаў, якіх трэба перакінуць з іншых раёнаў Магілеўскай акругі, а таксама з іншых округ Беларусі. Белкалгассаюз бярэ на сябе ўтрыманьне на працягу першых 6 месяцаў тых працаўнікоў, якія будуць выдзелены Менскам і Магілевам.

Неабходныя кадры калгасных кіраўнікоў, рахункаводаў і іншых работнікаў трэба чэрпаць з саміх калгасаў. Дзеля гэтага **неабходна арганізаваць двух-трох-месячныя курсы, якія-б існавалі бесьперапынна на працягу ўсёй зімы ў Клімавічах і падрыхтавалі-б з прадстаўнікоў калгасаў патрэбных работнікаў.**

Неабходна з прадстаўнікоў 20 калгасаў арганізаваць экскурсіі ў буйнейшыя калгасы СССР, якія маюць вялікі гаспадарчы вопыт, у прыватнасьці ў Еланскі раён суцэльнай калектывізацыі. Сродкі на экскурсіі выдзяляе Белкалгассаюз.

Каб забясьпечыць калгасы Клімаўшчыны ўсім неабходным, каб правесьці арганізацыю гаспадарак, трэба арганізаваць раённы калгассаюз. Іншых каапэрацыйных саюзаў стварацъ ня трэба. Пры раённым калгассаюзе павінны быць толькі работнікі—прадстаўнікі рознастайных каапэрацыйных галін, якія-б вялі сярод калгасаў чыста вытворчую працу.

Каапэрацыйныя цэнтры павінны перагледзець пляны індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі па сваёй лініі і ўдзяліць максымум увагі Клімаўшчыне. У працягу 5-ці дзён яны павінны прадставіць канкрэтныя меркаваньні па гэтым пытаньні.

Трэба абмеркаваць пытаньне аб суцэльнай калектывізацыі ўсёй Магілеўскай акругі ў працягу 5-цігодні, у сувязі з буйным тэмпам калектывізацыі ў радзе раёнаў гэтае акругі.

Сход выказаўся за тое, каб арганізаваць дэтальнае абсьледваньне Клімавіцкага раёну, каб мець магчымасьць скласьці грунтоўны арганізацыйны плян будаўніцтва ў гэтым раёне. Для гэтай мэты трэба стварыць спэцыяльную аўтарытэтную камісію з удзелам выдатных вучоных, якая-б працавала ў Клімаўшчыне на працягу ўсёй зімы і прадставіла-б овае меркаваньні. Белкалгассаюз ня мае магчымасьці выдзеліць патрэбныя сродкі на гэту мэту. З гэтай прычыны пытаньне аб сродках будзе ўзьнята на бліжэйшай сэсіі ЦВК.

Варта адзначыць, што рад работнікаў, якія прысутнічалі на сходзе і якія прадстаўлялі розныя цэнтральныя беларускія ўстановы, хутка пакінулі пасяджэньне, ня прыняўшы ўдзелу ў абмеркаваньні важнейшых пытаньняў. Цікава, між іншым, што прадстаўнікі Менскіх акруговых устаноў выяўлялі якраз вялікую актыўнасьць на гэтым сходзе.

Выканаць плян хлебазагатовак — да 12-ай гадавіны Кастрычніка

УСЕ СІЛЫ, УСЮ УВАГУ РАБОЧЫХ МАС НА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЭТАГА ЗАДАНЬНЯ!

Да ўсіх прафарганізацый, да ўсіх членаў прафсаюзаў БССР

Бурны рост сацыялістычнага сэктару народнае гаспадаркі, перавышэньне намечаных тэмпаў будаўніцтва патрабуюць ад кожнага рабочага, ад кожнага члена прафсаюзу максымуму энэргіі, творчай ініцыятывы і арганізаванасьці для перамаганьня труднасьцяй, якія няўхільна паўстаюць на шляху гэтага росту.

Аднэй з галоўных труднасьцяй зьяўляецца праблема забесьпячэньня хлебам і харчовымі прадуктамі. Пралетарыят вырашае гэту задачу, арганізуючы буйныя саўгасы і калгасы. Але разам в гэтым для плянавага забесьпячэньня гарадоў, асабліва рабочых цэнтраў і сялянскай беднаты хлебам і іншымі прадуктамі спажываньня для стварэньня патрэбных рэзэрваў, каб ня даць магчымасьці кулаку і спэкулянту ўзьнімаць цэны на хлеб і тым падрываць наша сацыялістычнае будаўніцтва, рабочай клясе і працоўнаму сялянству трэба ў максымальнай меры арганізавана і ў самы хуткі тэрмін правесьці хлебазагатоўчую кампанію. **Гэта кампанія павінна быць скончана да 1-га студзеня 1930 году.**

Весткі, якія маюцца на сёньня, сьведчаць аб тым, што хлебазагатоўчыя пляны па БССР выкананы на 73 проц. Бяднейшае сялянства, сераднякі і батрацтва дружна алгукнуліся на заклік партыі, згуртаваліся вакол не лёзунгаў і сьвядома выконваюць свае абавязкі перад краінай, здаючы свае лішкі пралетарскай дзяржаве. Навакол загатовак абвастрылася клясавая барацьба: кулакі хаваюць хлеб, каб сарваць хлебазагатоўкі, каб зламаць палітыку цэн. Прафсаюзы ўжо пасылалі свае брыгады на хлебазагатоўкі. Яны арганізоўвалі беднату і серадняка для адпору кулаку, арганізоўвалі чырвоныя абозы, выкрывалі сапраўдныя мэты кулацтва і задачы батрацтва, беднаты і серадняка. Але гэта работа праведзена яшчэ не ў належнай меры, трэба зараз-жа кінуць новыя рабочыя брыгады на дапамогу хлебазагатоўкам.

Цэнтральны савет прафсаюзаў БССР далкам падтрымлівае адозву ЎсеЦСПС аб хлебазагатоўках і заклікае прафарганізацыі БССР напружыць усе сілы для ажыцьцяўленьня дырэктыў.

Таварышы рабочыя! Арганізуйце брыгады, пасылайце іх на вёску, арганізуйце рашучы адпор кулацтву, якое перашкаджае сацыялістычнай перабудове народнай гаспадаркі, узмацнеце свой канкрэтны ўдзел у выкананьні важнейшага гаспадарча-палітычнага мерапрыемства партыі і ўлады.

Таварышы рабочыя, асьветнікі, дактары, работнікі дзяржаўных устаноў, якія знаходзяцца на вёсцы!

Вы больш за ўсё сустракаецеся з сялянствам, на вас ускладаецца адказнейшая задача як у справе растлумачэньня сялянству значэньня хлебазагатовак, так і ў справе арганізацыі здачы лішкаў, арганізацыі адпору кулаку.

Таварышы рабочыя і служачыя, якія маюць свае гаспадаркі, будзьце надбухторшчыкамі ў арганізацыі прафсаюзных абозаў. Арганізуйце спаборніцтва на здачы лішкаў, прыцягнеце да гэтай справы бядняцка-серадняцкія масы вёскі.

Таварышы рабочыя і служачыя, арганізуйце збор тары (мяшкоў), арганізуйце рабочы кантроль за складамі, за хлебазагатоўчымі арганізацыямі, арганізуйце суботнікі для хуткай разгрузкі і цягрузкі хлеба на чыгунцы, не дазваляйце прастояў і затораў.

Таварышы сельгаспрабочыя і батракі! Дапамагайце выразнаму і хуткаму разгортваньню хлебазагатоўчай кампаніі на вёсцы, выкрывайце кулацтва, якое ня хоча аддаць свае лішкі, выкрывайце нядбайных сельсаветчыкаў і агентаў кулацтва, якія пралезьлі ў каапэрацыю, у загатоўчы апарат, арганізуйце беднату і калгасьнікаў для адпору кулацтву, арганізуйце здачу калгасамі і саўгасамі сваіх лішкаў да 12-й гадавіны Кастрычніка.

Таварышы, работнікі хлебазагатоўчых апаратаў і нізавыя працаўнікі саюзу савецкіх і гандлёвых служачых! Узмацнеце выхаваўчую работу сярод работнікаў хлебазагатоўчага апарату, растлумачце ім усю адказнасьць іх работы, рашуча ачышчайце апарат ад тых, хто ня хоча працаваць рэвалюцыйным тэмпам, хто бяздушнымі і бюракратычнымі адносінамі да сялянства перашкаджае хлебазагатоўкам і грае на руку клясаваму ворагу.

80 проц. гадавога заданьня — да XII гадавіны Кастрычніка. На ажыцьцяўленьне і поравыкананьне гэтага лёзунгу ЎсеЦСПС накіруем усе сілы, усю ўвагу рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Цэнтральны Савет Прафсаюзаў Беларусі.

Да зьезду ударных брыгад засталося мала часу

УЗМОЦНІМ ПАДРЫХТОЎКУ, СКАРЫСТАЕМ ЯЕ ДЛЯ ПАЛЕПШАНЬНЯ ПРАЦЫ БРЫГАД

Падтрымаем ініцыятыву мас, акружым брыгады атмасфэрай грамадзкай увагі і садзейнічаньня

Што замінае працы ўдарнікаў

Гарбарня «Бальшавік» ня выканала поўнасьцю прамфінпляну ў адносінах зьніжэньня сабекошту і ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы, ня выканала сваіх абавязкаў па сацыялістычным дагаворы, які быў заключаны з іншымі прадпрыемствамі гарбарнай прамысловасьці.

Агляд і падагульненьне ўсяго ходу сацыялістычнага спаборніцтва, якія зараз праводзяцца на «Бальшавіку», павінны выявіць прычыны паражэньня на асобных вучастках сацспаборніцтва.

Зводзяць свой першы баланс і ўдарныя брыгады—перадавыя калектывы рэвалюцыянэраў і энтузіястых вытворчасьці. Баланс гэты, ня гледзячы на рад дасягненьняў, не актыўны.

Чаму-ж гэта так здарылася?

Брыгады стварыліся на гарбарні стыхійна, кампанейскім парадкам. У іх увайшлі адзінкі, найбольш перадавыя рабочыя заводу—з моладзі і старых рабочых. З 800 чал. ня больш 40-50 сталі ўдарнікамі. Многія рабочыя досыць гіпарэтычна глядзелі на гэту «забаву». Былі нават выпадкі, калі пасьмейваліся з асобных брыгад.

— Куды ім—гаварылі рабочыя.—Браліся-б за мяккае дрэва.

Але гэта ніколькі не прывяло ў замяшаньне нашых ударнікаў. Узрасла актыўнасьць рабочых, узьнялася працоўная дысцыпліна. Асобныя брыгадзіры паказалі ўзоры гэрайчных адносін да вытворчасьці і заражалі сваім энтузіязмам іншых рабочых.

Рэзачнае аддзяленьне перавысіла сваё заданьне звыш дагавору на 50 проц. Якасьць зołкі палепшылася на 75 проц.

Дзякуючы ўзмоцненай рабоце ўдарнай брыгады, у мэханічным цэху зьменшыліся прагулы і прастоі. Раней на аднага рабочага прыпадала да 6 дзён прагулу, а зараз бяз уважлівых прычын няма ніводнага прагульшчыка. Палепшылася і якасьць работы. Прастоі машын скарацілися з 200 да 5 гадз. у месяц.

Ссыпшчыкі каніны у чырвонадубным цэху далі 8 проц. зьніжэньня сабекошту. Работу, якую раней выконвалі 6 рабочых, цяпер выконваюць—4, выробляючы, як і раней, 150 скур.

У зольным аддзяленьні жэлятыннага цэху была спроба сарваць работу. Невялікая частка рабочых прабавала зьменшыць норму выпрацоўкі. Ударная камсамольская брыгада на справе даказала, што норму можна нават павысіць, а ня зьменшыць. І ўдарнікі павысілі прадукцыйнасьць працы на 100 проц.

Але брыгады амаль з першага-ж моманту аказаліся бяз жывой дапамогі, **таварыскага акружэньня і падтрыманьня з боку заводзкіх грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый.** Цэхавыя арганізацыі як-бы не заўважвалі існаваньня ўдарных брыгад, яны былі бяспрытульны і забыты.

Заўком, як прафсаюзная арганізацыя, ня вылявіў сваёй кіруючай ролі ў гэтай справе і не паказаў, як ён перабудаваў сваю работу ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі тэмпаў жыцьця.

Партыйная і камсамольская ячэйкі, якія па сутнасьці павінны быць застрэльшчыкамі ўсякага перадавога руху на вытворчасьці, невыстарчальна растлумачылі рабочым масам значэньне сацспаборніцтва і ролю ўдарных брыгад, не праводзілі выхаваўчай работы.

У мэханічным цэху ня было праведзена ніводнага сходу па пытаньні аб сацспаборніцтве і ўдарных брыгадах. Ня дзіва, што многія рабочыя не ўсьвядомілі яшчэ значэньня ўдарных брыгад у сацыялістычным спаборніцтве.

Ня было і адпаведнай вытворча-бытавой абстаноўкі для работы ўдарнікаў. Так, у мэханічным цэху працуе 10-12 сьлесароў, а ціскоў устаноўлена толькі 6. Калі частка сьлесароў працуе—рэшта стаіць у чарзе. Няма належнага абсталяваньня. Сьвідравальны варштат па разьмеры вельмі малы і таму здараюцца прастоі.

Ні ўдарныя брыгады, ні заводзкія арганізацыі ня ведаюць дакладных вынікаў работы ўдарнікаў. Няма належнага падліку.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гарбарні «Бальшавік» і ў першую чаргу камсамол павінны бязадкладна ўжыць рашучыя меры да зьнішчэньня прычын, якія перашкаджаюць ударным брыгадам нармальна працаваць і разьвівацца. Трэба ўзяць работу ўдарных брыгад пад баявы грамадзкі кантроль.

М. К.

Больш дапамогі перадавіком сацспаборніцтва

У вагонных майстэрнях Менскага чыгуначнага вузла ў парадку сацыялістычнага спаборніцтва былі арганізаваны 16 ударных брыгад. Брыгады арганізаваны ва ўсіх цэхох — 4 малярных, 7 сталярных, 5 сьлясарных і адна брыгада балтарэзаў.

Першая сьлясарная брыгада з 10 камсамольцаў была арганізавана зараз-жа пасьля выкліку «Комсомольской Правды» аб арганізацыі камсамольскіх брыгад.

Усяго брыгадамі ахоплена звыш 100 рабочых, з якіх 23 партыйцы і 18 камсамольцаў, а рэшта — рабочыя ва ўзросьце ад 30 год і больш.

Ударныя брыгады цалкам зьнішчылі прагулы і спазьненьні. Процант браку даведзены да мінімальнай колькасьці, а ў камсамольскай брыгадзе брак бадай поўнасьцю зьнішчаны.

Ня гледзячы на цэлы рад перашкод і адсутнасьць усялякага кіраўніцтва і дапамогі як з боку адміністрацыі, так і мясцкому, рабочыя брыгады дабіліся значных посьпехаў.

А перашкод было ня мала.

Брыгадзір камсамольскай брыгады т. Мікуліч і сакратар камсамольскай ячэйкі т. Мяхэдка, які працуе ў гэтай брыгадзе, могуць расказаць ня мала аб гэтых перашкодах. Калі арганізавалася камсамольская брыгада, адміністрацыя спаткала яе з недавер'ем. Былі нават спробы падарваць аўтарытэт брыгады, які яна заваявала сярод рабочых. Так, брыгадзе было дана заданьне адрамантаваць тры вагоны. Брыгада ўзялася за працу і скончыла-б яе ў той-жа дзень. Але, дзякуючы нераспарадчасьці адміністрацыі, не хапіла матар'ялаў і работу прышлося спыніць. На заўтра-ж на дошцы сацспаборніцтва было напісана, што камсамольская брыгада адстае. Толькі пасьля доўгіх довадаў гэты надпіс быў зьняты. Ня гледзячы на такія ўмовы працы, камсамольская брыгада давяла, што можна зрабіць пры злучанай і наладжанай працы. У выніку брыгада была ў верасьні прэміявана ў 100 руб., як лепшая ў майстэрнях.

Трэба адзначыць, што тэхнічнага кіраўніцтва ўдарных брыгадны не атрымліваюць да гэтага часу. Яшчэ ня зьнішчаны прастоі а-за адсутнасьці правільнага забесьпячэньня патрэбнымі матар'ялам. Нават ва такімі дробнымі матар'ялам, як шрубы і гайкі, якія ў штодзеннай працы неабходны, брыгадзіру прыходзіцца бегчы і спрачацца, каб іх дастаць.

Прафарганізацыя вельмі слаба дапамагае і цікавіцца ўдарнікамі і ўмовамі іх работы. Фармальна адносіцца да падбору людзей у брыгады. Так, у камсамольскай брыгадзе захварэў адзін чалавек. Калі хворы зьявіўся на працу, яго залічваюць чамусьці ў іншую брыгаду. Мясцком ня ідзе насустрач камсамольскай брыгадзе, і прыходзіцца працаваць з людзьмі, якія адстаюць ад агульнага тэмпу работы.

Рабочыя брыгады дабіліся значных посьпехаў у павышэньні прадукцыйнасьці працы. Так, па сярэднім рамонце вагонаў дасягнута зьніжэньне затраты часу на 11 проц. і зьніжэньне кошту рамонту на 21 проц. Па бягучым рамонце затрата часу зьніжана на 40 проц., кошт рамонту — на 31 проц.

Ня гледзячы на добраахвотнае зьніжэньне расцэнак, павялічылася зарплата рабочых-ударнікаў. Так, камсамольская ударная брыгада з 7 чал. за верасень выпрацавала 790 руб. Другая група з 9 рабочых пяўдарнікаў на больш лёгкай рабоце за гэты-ж нарыд выпрацавала ўсяго 730 руб.

Учора адбыўся сход ударных брыгад, на якім была заслухана інфармацыя аб задачах і мэтах зьезду ўдарных брыгад і былі выбраны дэлегаты.

Цікава адзначыць, што мясцком хацеў паслаць на зьезд абавязкова «барадача». Але сход в гэтай прапановай не згадзіўся і пастанавіў паслаць на зьезд рабочага-камсамольца, аднаго з лепшых і першых ударнікаў, т. Райко. У кандыдаты быў выбраны т. Мяхэдка, ударнік камсамольскай брыгады.

А—о.

Статыстычнае шкодніцтва,

або як сельсаветы і с.-г. таварыствы брапі з столі весткі аб ураджаі

Пытаньне хлебафуражнага балянсу, пытаньне аб велічыні ўраджаю збожжа, мае актуальнае значэньне для ўсяго плянаваньня народнае гаспадаркі.

Дагэтуль весткі аб ураджаі ЦСУ Беларусі атрымлівала ад сеткі добраахвотных карэспандэнтаў.

У гэтым годзе, прымаючы пад увагу адказнасьць і важнасьць гэтага пытаньня, ЦСУ Бел. зьвярнулася, акрамя дабракораў да сельсаветаў, спажывецкай і с.-г. каапэрацыі, да машынных і мэліярацыйных таварыстваў з тым, каб пры іх дапамозе можна было карактаваць весткі сеткі.

Праца гэта праведзена, як вопыт, каб у далейшым перайсьці стала да масавага атрымліваньня статыстычных вестак ад сельсаветаў.

І што-ж мы атрымалі? Сьмеху варта. Ня гледзячы на тое, што 1929 год паводле даных Белгеафізу зьяўляецца вельмі спрыяючым для ўсіх крытычных момантаў вегетацыі палявых культур, Забалоцкі сельсавет нам дае наступныя весткі па сваім сельсавеце.

50 проц. гібелі пасеваў яравой пшаніцы, 35 проц. гібелі пасеваў жыта, 75 проц. гібелі пасеваў ячменю, 20 проц. гібелі пасеваў грэчкі, 50 проц. гібелі пасеваў бульбы.

Падобныя весткі далі Лошніцкі, Брадоўскі, Забашэвіцкі, Кішч.-Слабодзкі, Бытчанскі сельсаветы Барысаўскага раёну.

Ня ўступаюць яму сельсаветы Бярэзінскага раёну: Бярэзінскі, Мошчаніцкі, Пагоскі, Мачэўскі, Перавоскі і інш.

Дайшло да таго, што ў Сеніцкім сельсавеце Самахвалавіцкага раёну ўраджай азімай пшаніцы — 210 пудоў в дзесяціны, ураджай яравой 180 пудоў, ураджай ільну—85 пуд. в дзесяціны.

У Крупіцкім сельсавеце таго-ж раёну ўраджай жыта — 140 пудоў в дзесяціны, ураджай пшаніцы — 180 пудоў, ураджай ільну — 180 пуд., а бульбы ўсяго 400 пудоў.

Каб гэта было так у сапраўднасьці, было-б вельмі добра. Гэта-ж сапраўдная Нямеччына, ды яшчэ звыш-Нямеччына.

Але-ж бяда ў тым, што гэткі ўраджай відаць толькі ў саміх сельсаветчыкаў, якія, седзячы ў сябе на лаве ў сельсавеце, са столі, а то, можа, яшчэ з якога месца выкалупалі **такія шкодніцкія, такія хлусьлівыя весткі, за якія варта ўжыць усе меры рэвалюцыйнай законнасьці.**

Як падыйшлі да справы ўраджаю нашы спажывецкая, с.-г. каапэрацыя, машынныя, мэліярацыйныя таварыствы.

В'юнаўскае мэл. таварыства, Пагоскага сельсавету, Бярэзінскага раёну, паведамляе: жыта азімае — 30 проц. гібелі, ураджай 6,5 цэнтнэраў з дзесяціны, ячмень — 60 проц. гібелі, ураджай 3,5 цэнтнэраў, авёс — 30 проц. гібелі, ураджай 7,75 цэнтнэраў і грэчка — 50 проц. гібелі, ураджай 1,5 цэнтнэра з дзесяціны.

Усьцяж ідуць Чырвона-Горскае машыннае таварыства «Чырвоны Маяк» і іншыя. Процанты гібелі і нізкія, недапушчальна нізкія ўраджаі пасьпаліся, што град. Хоць-бы быў град, вымачкі, або сухмень, тады-б яшчэ можна было веры даць. Нічога гэтага-ж няма і ня было ў гэтым годзе.

Чым-жа гэта тлумачыцца? У чым справа?

Я лічу, што большасьць працаўнікоў сельсаветаў, каапэрацыі, машынных і мэліярацыйных таварыстваў, ня гледзячы на папярэджаньні ў інструкцыях ЦСУ аб вялікай каштоўнасьці вестак аб ураджаі, **проста праявілі нядбайныя адносіны да гэтай справы,** улічваючы, што гэта толькі «статыстычныя якіясь выкрутасы». **Інакш, як шкодніцтвам, мы такую працу назваць ня можам.**

Райвыканкомы, пільней сачэце за працай і складам сваіх нізавых працаўнікоў.

РСІ трэба пацікавіцца матар'ялам, які ёсьць у Менскім акрстатбюро (сэкцыя с.-г. статыстыкі) і выкрыць злачынцаў. Так пакінуць гэта нельга.

Праўда, ня ўсе сельсаветы і т-вы так сябе праявілі.

Добра да справы падыйшлі сельсаветы Навадворскі, Самахвалавіцкага раёну, Пліскі, Смалявіцкага раёну і інш.

Яны зразумелі ўсю адказнасьць, якую на іх накладае кожная лічба, кожнае слова.

БЭРНШТЭЙН.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ

Сані для зімы рыхтуй улетку

Калі ў мінулым годзе выбіралася новае праўленьне клюбу саўгандальслужачых, то гэта пытаньне доўга абмяркоўвалася на агульных сходах, на пасяджэньнях фракцыі ЦП саюзу, на справаздачнай канфэрэнцыі членаў клюбу. Здавалася-б, што пасьля такога старанага падбору праўленьне павінна быць працаздольным, актыўным. Але выявілася, што з выбраных 15-18 «актывістых» працавалі толькі 3-4 чалавекі.

Як вялася работа клюбу?

Можна сьмела сказаць, што работа вялася толькі ў напрамку тэатральшчыны. Мала таго, што гурткі клюбу ставілі кенскія п'есы, два члены праўленьня супольна з старшынёю культаддзелу ЦП саюзу паехалі ў Ленінград па артыстычныя сілы. Беларускія артыстычныя сілы ўжо ня былі ў стане задаволіць тонкія густы членаў саюзу і клюбу. Як і трэба было чакаць, ленінградзкія «знаменитости» (якім заплацілі досыць вялікую суму) зусім ня мелі посьпеху і праўленцам здорава дасталася.

Тэатральшчына і ўсе яе вынікі (прафэсыянальнае акторства, бараньба за ролю, склокі ў гурткох на глебе ігры і т. д.) знайшлі сабе прытульнае месца ў сьценах клюбу. Фінансавага пляну зусім ня было, грошы траціліся бяссыстэмна, да рамонту клюбу прыступілі толькі зараз. ЦП саюзу клюбнай працай зусім мала цікавіцца.

— Трэба было аб рамонце паклапаціцца ў чэрвені, а ня ў верасьні і «сані для зімы падрыхтаваць улетку»,—кажуць зараз члены клюбу.

ВОКА.

Замест папулярызацыі—ашуканства

Сакратар Нараўлянскага лясьніцтва Гаравы знайшоў новы спосаб разьмяшчэньня аблігацый 3-яй пазыкі індустрыялізацыі.

Калі гр-ка м. Нароўля Бухман Фэйга начала рамантаваць страху хлява, ёй сказалі, што трэба ўзяць у мясцовым савеце дазвол. З тэй прычыны, што Бухман Фэйга ўжо надта старая і няпісьменная, яна за дазволам зьвярнулася не ў мясцовы савет, а ў лясьніцтва, а там сакратар Гаравы, замест таго, каб растлумачыць 70-цігадовай жанчыне, даў ёй 5-цірублёвую аблігацыю ды сказаў, што больш ніякага дазволу ня трэба.

Праз некалькі дзён Бухман атрымала штрафны ліст на 20 руб. за парушэньне правіл аб рамонтах.

Пілеўман.

Пахвалі пратакол

Яшчэ 13-га ліпеня ў Няміга-Ракаўскай вуліцы ў доме Кагана курсантам-трактарыстым Менскай аб'яднанай прафтэхшколы тав. Адліванкіным, І. Я., і міліцыянэрам 2-га аддзяленьня міліцыі тав. Скапаўцом, І. С., была выкрыта абуткоўная і кравецкая саматужная майстэрня, якая працавала ў нязьвычайны час і без патэнту. Майстэрня належала Сагаловіч Фрэйдзе. Курсантам Адліванкіным і міліцыянэрам Скапаўцом быў складзены адпаведны пратакол і накіраваны ў другое аддзяленьне міліцыі для прыняцьця належных мер. Але вось чамусьці гэты пратакол у міліцыі недзе запрапасьціўся, а майстэрня і на сёньняшні дзень працуе.

Трэба міліцыі хутчэй «выкапаць» гэты пратакол і прыцягнуць да адказнасьці Сагаловіч Фрэйду за парушэньне закону аб саматужніцкіх майстэрнях.

РАБКОР.

Белсампрамсаюзаўскія „арцелі"

Досыць часта пад сьцягам саматужніцкіх арцеляй розныя «былыя людзі», гандляры і нэпманы робяць свае махінацыі. Асабліва гэта датычыць арцеляй смалакураў.

Вось некалькі прыкладаў:

У смалакурнай арцелі Гарошыцы (Мазырскі раён) «абраляюць» свае справы пазбаўленыя, адзін з якіх зьяўляецца былым буйным уласьнікам млыну.

У смалакурнай арцелі «Пціч» (Мазыршчына) над відам арцельшчыкаў «працуюць» уласьнік дзягцярнага заводу Фрыдман і гандляр Гарохаў.

У смалакурнай арцелі пры станцыі «арцельшчыкі» самі працаваць ня хочуць, а наймаюць рабочага за 30 рублёў у месяц. Для таго, каб лепш утаіць свае махінацыі, яны афіцыйна лічаць яго сваім пайшчыкам і з яго зарплаты кожны месяц затрымліваецца 10 рублёў, нібы для пакрыцьця паю. Такім чынам, спэкулянты і пазбаўленыя хаваюцца за плечы рабочага ды спосабам ашуканьня кожны месяц не даплачваюць яму па 10 рублёў.

Шмат такіх «спосабаў» ёсьць у Смалявіцкім раёне і ёсьць падстава думаць, што такія махінацыі робяцца скрозь...

Трэба зараз-жа праверыць усю сетку смалакураных арцеляй і выкурыць адтуль спэкулянтаў і гандляроў.

РАБКОР.

Белсельсаюз зрывае загатоўкі гусей

Пачнем проста з фактаў: 25-га ліпеня г г. Белдзяржгандаль заключыў з Белсельсаюзам дагавор на здачу апошнім першаму ў працягу верасьня-лістапада 50.000 штук жывых гусей. На падставе дагавору Белсельсаюз на наступны-ж дзень атрымаў ад Белдзяржгандлю 30.000 руб. спэцыяльна на загатоўку гусей.

Абодва бакі задаволены, асабліва задаволены Белдзяржгандаль, бо невыкананьне леташняга дагавору на дастаўку гусей каштавала Белдзяржгандлю шмат грошай...

У дагаворы чорным па белым сказана: у верасьні Белсельсаюз здае 15 тысяч гусей, у кастрычніку — 20 тысяч, а ў лістападзе — 15 тысяч.

Мы яшчэ больш вам дамо — хваліліся белсельсаюзаўцы, што для нас знаходы сходы — усе абмяркоўваюць справу калектывізацыі.

— Добра, адказалі задаволеныя з Белдзяржгандлю — прымем колькі вы нам дасьцё і звыш нормы.

Але наступіў верасень. Бельсельсаюз яшчэ ня здаў ні аднэй гусі.

Кастрычнік канчаецца — Белсельсаюз здаў 600 гусей...

Вось як Белсельсаюз выконвае свае абавязацельствы, як ён разумее свае ўдарныя заданьні. А заданьне гэта сапраўды ўдарнае, бо вышэйшыя дырэктыўныя органы прапанавалі Белдзяржгандлю экспартаваць гусей, а апошні на падставе дагавору з Белсельсаюзам запрадаў гусей замежнай фірме.

Пачалася бюракратычная перапіска паміж Белдзяржгандлем і Белсельсаюзам, якая не дала ніякіх вынікаў. Белсельсаюз адказаў, што выкананьне дагавору на гусей ён перадаў... Беларусюзу, а апошні зваротнай поштай піша, што «ён нічога ня ведае», бо ён ніякіх дагавароў ад Белсельсаюзу ня прыняў...

Белсельсаюз добра ведаў, што Белдзяржгандаль

Да перавыбараў рэдкалегій насьценгазэт

Забыты вучастак работы

(Мазырская акруга)

Насьценная газэта зьяўляецца адным з галоўных вагароў разгортваньня самакрытыкі. Але мы ўжо ня раз адзначалі, што самакрытыка на Мазыршчыне стаіць не далёка на належнай вышыні. Вось чаму нашы насьценныя газэты знаходзяцца далёка не ў пашане і на гэту работу не зьвяртаюць належнай ўвагі. Акругком КП(б)В абмежаваўся толькі тым, што разаслаў усім партячэйкам дырэктыўны ліст і склікаў адну мізэрную нараду рэдкалегій гораду, на якой прысутнічалі прадстаўнікі ўсяго 12-ці рэдкалегій. Толькі некаторыя партячэйкі абгаварылі гэта пытаньне на бюро ячэек, а ў большасьці як у партыйных, так і камсамольскіх ячэйках гэтага пытаньня яшчэ не абмеркавалі, а таму ясна, што ўся маса як партыйцаў, так і беспартыйных ня мае ніякага разуменьня аб набліжэньні кампаніі перавыбараў рэдкалегій насьценных газэт. Выпускаецца ў г. Мазыры адзіная друкаваная насьценная газэта «Заводзкі Гудок», якая ахапляе ўсе вытворчыя прадпрыемствы гораду. Да гэтага часу яшчэ не абгаварылі пытаньня аб перавыбарах сваёй рэдкалегіі. Насяджэньне рэдкалегіі гэтай газэты па гэтым пытаньні было назначана на 26 кастрычніка г. г., але яно не адбылося, бо большасьць членаў рэдкалегіі не зьявілася на гэта насяджэньне. Усё гэта гаворыць за тое, што падрыхтоўчая работа ў нас ўжо сарвана і ня можа быць ніякай гутаркі аб пачатку перавыбараў рэдкалегій па Мазыршчыне з 1-XI, як гэта было намечана. У гэтай кампаніі ня прымаюць удзелу ні толькі грамадзкія арганізацыі, але нават і прафсаюзы ў гэтых адносінах нічога не зрабілі, ня гледзячы на тое, што некалькі дзён таму назад скончыўся пленум акрпрафсавету. Гэтага пытаньня на пленуме ніхто не закрануў і яго нават не паставілі хаця-б у выглядзе інфармацыі ў бягучых справах.

Ясна, што пры адсутнасьці поўнага кіраўніцтва з боку Акрпрафсавету прафсаюзы нічога наконт гэтага не зрабілі і ніякіх дырэктыў сваім нізавым ячэйкам не давалі. Патрэбны тэрміновыя меры для таго, каб разбудзіць нашы акруговыя арганізацыі і пасунуць справу ўперад, інакш мы станем перад фактам поўнага зрыву кампаніі перавыбараў рэдкалегій насьценных газэт.

М. ВАПЕЛЬНІК.

Больш увагі заводзкім друкаваным газэтам

Нядаўна ў Гомелі адбылася нарада рэдкалегій друкаваных фабрычна-заводзкіх газэт. На гэтай нарадзе былі прадстаўлены газэты мэталістых «Красная Вагранка» (завод «Пралетары»), друкароў «Ратацыя», (Палесдрук) абутнікаў «Красное Шило» (фабрыка «Труд»), хэмікаў «Тиски» (фабр. «Вэзувій»), «Днепровец» (ф-ка запалак «Дняпро»), швэйнікаў «Голос Швейника» (фабр. «Камінтэрн») і інш.

На жаль, арганізатары нарады—АПА АК і рэдакцыя газэты «Полесская Правда» не паклапаціліся хоць крыху падрыхтаваць гэту нараду: ня было зроблена папярэдняга вывучэньня стану газэт ня толькі шляхам жывога абсьледваньня на месцы, але нават шляхам простага азнаямленьня з камплектамі ўжо выпущаных нумароў газэт, каб азнаёміць нараду з удалай практыкай пасобных газэт.

Ня гледзячы, аднак, на гэткую непадрыхтаванасьць, на нарадзе высьветлілася шмат цікавага і вельмі значнага для характарыстыкі становішча нізавога друку.

Друкаваныя заводзкія газэты карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод рабочых. Друкаванае слова вельмі моцна ўплывае, пытаньні, што ўзьнімаюцца газэтай, знаходзяць дружны водгук і падтрыманьне ў масах, мабілізуючы грамадзкую думку рабочых вакол баявых лёзунгаў партыі. Пытаньні сацыялістычнага спаборніцтва, бесьперапынкі, зьніжэньня сабекошту і паляпшэньня якасьці прадукцыі, пытаньні чысткі партыі, барацьбы з п'янствам і інш. хва ра вятымі зьявішчамі—усё гэта знаходзіць свой адбітак у газэтах. Асобныя газэты з посьпехам праводзяць праверку дагавароў па сацыялістычным спаборніцтве—выпускаюць спэцыяльныя аглядавыя нумары.

Друкаваную газэту з вялікім захапленьнем чытаюць таксама жонкі рабочых, якія, такім чынам, знаёмяцца з жыцьцём на прадпрыемстве і ўцягваюцца паступова ў кола пытаньняў вытворчага і грамадзкага жыцьця прадпрыемства. Газэты выхоўваюць новыя кадры рабочых, вакол іх вырастаюць нізавыя працаўнікі друку, маладыя пісьменнікі, будучыя паэты. Паасобныя газэты ўзьнімаюць у зьвязку з гэтым пытаньне аб прымацаваньні да прадпрыемстваў, у парадку грамадзкай работы, членаў філій БелАПП'у.

Але друкаваныя газэты—гэта справа яшчэ зусім новая. Яны вырастаюць амаль што стыхійна. Яны патрабуюць да сябе вялікай увагі з боку кіруючых органаў. А гэтай увагі і належнага кіраўніцтва пакуль што яшчэ няма.

Досыць часта ў плянах ячэйкі нават не прадугледжваюцца пытаньні кіраўніцтва газэтай, заслухоўваньне дакладаў рэдакцыі газэт. Адсюль тыя недахопы, які мы наглядаем у гэтай справе.

Для характырыстыкі **палітычнай выразнасьці фармулёвак** у газэтах падамо хоць-бы такі прыклад: газэта «Красное Шило» піша: «Особенная заслуга нашей газеты в ее **эластичности**» справа ідзе аб насьценгазэце), а далей, у гэтым артыкуле гаворыцца яшчэ: «Красное Шило» и на сей раз проявляет свою **эластичность** и переходит на печатную фабричную газету». Тут напэўна мелі па ўвазе выказаць тую думку, што газэта своячасова адгукалася на важнейшыя пытаньні, якія высоўваліся на прадпрыемстве на кожным этапе ее дзейнасьці, а вось замест гэтага газэта прапагандуе эластычнасьць, як асаблівую сваю заслугу, маса выхоўваецца ў тым напрамку, што эластычнасьць, а не бальшавіцкі вучот сваёасаблівасьцей данай канкрэтнай абстаноўкі зьяўляецца вартасьцю газэты.

Зусім нездавальняючае становішча з **разгортваньнем самакрытыкі**. Досыць часта—гэта крытыка імённа «гледзячы на асобы». Асабліва шмат клопатаў рэдактарам калі яны вымяшчаюць заметку пра партыйца («Красная Вагранка»). На нарадзе паказвалі і на такія газэты, якія не жадаюць, відаць, сварыцца са сваёй адміністрацыяй, імкнуцца жыць адны з адным мірна, ціха («Ротация»).

Але самае балючае зьявішча—гэта слабое ці зусім нездавальняючае **рэагаваньне** на заметкі ў газэтах з боку адміністратараў і фабзаўкомаў. Нізавыя партыйныя ячэйкі і райкомы не падхапліваюць сьмелага пачынаньня газэт у пастаноўцы вострых пытаньняў і не садзейнічаюць газэтам у давядзеньні да канца ўзьнятых пытаньняў. Самі газэты таксама ня могуць пахваліцца настойлівасьцю ў гэтым напрамку. Ня гледзячы на рад дырэктыў 4-й Усесаюзнай нарады рабселькораў і пастановы ЦКК КП(б)Б ад 15/1—1929 г., ні адна газэта не паставіла рашуча пытаньня аб тых, што злосна не адказваюць на заметкі—у сваёй ці акруговай або ў цэнтральных газэтах, не гаворачы ўжо аб арганізацыі паказальнага грамадзкага суду на прадпрыемстве. Ня ўсюды арганізаваны бюро дасягненьняў і расьсьледваньняў пры рэдакцыях газэт. Пакуль што слабая яшчэ дзелавая сувязь з органамі КК-РСІ, вельмі рэдкія выпадкі зваротаў газэт за дапамогай ці высоўваньне пытаньняў перад органамі КК-РСІ.

Калі «Днепровец» прысьвяціў цэлую старонку, дзе бічуюцца органы, што адмоўваюцца, дык, па словах прадстаўніка газэты, гэта зрабіла добры ўплыў, заварушыліся, сталі паступаць адказы, прызначылі нават спэцыяльную камісію для расьсьледваньня ўсіх заметак. Пры гэткай ініцыятыве самых газэт і падтрыманьні нізавых парторганаў мы даб'ёмся патрэбных вынікаў у справе рэагаваньня на крытыку ў нізавым друку.

Вельмі дрэнна з **беларусізацыяй**. Вось цікавы факт для характарыстыкі адносін паасобных нізавых кіраўнікоў да пытаньняў беларусізацыі. Калі на заводзе «Пралетары» абмяркоўвалі пытаньне наконт таго, як назваць і на якой мове друкаваць назву газэты, дык, ня гледзячы на прапановы некаторых таварышоў з рэдкалегіі, друкаваць назву газэты пабеларуску: «**Чырвоны Вагранка**», гэта знайшлі напэўна непадыходзячым і парашылі друкаваць парасійску: «**Красная Вагранка**». Для характарыстыкі агульнага становішча і тэмпу беларусізацыі друкаваных газэт даволі прывесьці наступнае рашэньне нарады: да 1-га студзеня 1930 году перавесьці зьмест газэт толькі на 25 проц., прытым газэты толькі прадпрыемстваў, дзе ў складзе рабочых ёсьць пераважна беларусы.

На нарадзе было ўзьнята яшчэ адно цікавае пытаньне: наконт **платнасьці** газэт. Многія таварышы на падставе сваёй практыкі выказваліся за платнасьць друкаваных газэт (1 рубель за год). Гэта, акрамя матар'яльнай дапамогі, адыгрывае вялікую ролю ў сэнсе павялічэньня зацікаўленасьці рабочых да газэты і акуратнага яе выпуску з боку рэдкалегіі, бо калі затрымліваецца выхад чарговага нумару, рабочы падштурхоўвае рэдкалегію «раз узялі грошы, дык давайце газэту».

І, урэшце, яшчэ аб **кіраўніцтве**. Рэдакцыя газэты «Полесская Правда» вельмі мала інструктуе і дапамагае газэтам у адносінах дачы ім парад па частцы тэхнічнага афармленьня газэт, а галоўнае ва ўсіх іх штодзённых цяжкасьцях па складаньні газэты. «Полесская Правда», хаця і мае спэцыяльнага працаўніка па гэтых справах, але ён, будучы загружаны іншай працай у рэдакцыі, фактычна заводзкім газэтам амаль ніякай дапамогі не аказвае.

У адносінах палітычнага кіраўніцтва заводзкімі газэтамі, нам здаецца, што гэта павінна ажыцьцяўляць агітпропы акругкомаў і райкомаў. Яны павінны ўважліва прачытваць нумары газэт, што выходзяць, і на канкрэтным матар'яле і канкрэтных памылках навучыць рэдкалегіі праводзіць у газэтах правільную, вытрыманую палітычную лінію нашае партыі.

М. Зярніцкі.

ЧАМУ САРВАЛАСЯ НАРАДА РАБСЕЛЬКОРАЎ

27-га кастрычніка г. г. павінна была адбыцца нарада селькораў на станцыі **Талька** (Пухавіцкага раёну, Меншчына). На нараду павінны былі зьявіцца селькоры з **Суцінскага, Блуцкага і Талькаўскага** сельсаветаў.

«Падрыхтоўку» да нарады праводзіў Пухавіцкі райком партыі... Мы павінны проста сказаць, што ніякай падрыхтоўкі да нарады ня было. Райком абмежаваўся дасылкай абвестак па сельсаветах аб тым, што 27 кастрычніка адбудзецца нарада. Мясцовая парт'ячэйка зусім не паклапацілася аб падшуканьні памяшканьня для нарады. Партыйная ячэйка ведала, што склікаецца нарада (у «Беларускай Вёсцы» аб гэтым было абвешчана), а між тым сакратар ячэйкі т. **Кароткі** дазволіў т. **Сьвірыдовічу** (старшыня рабачкому, камсамолец) склікаць прафсаюзны сход, на якім было запята некалькі рабкораў і селькораў.

Талькаўскі сельсавет, як і парт'ячэйка, як і райком, таксама нічога не зрабіў у справе паведамленьня селькорам. Сельсаветчыкі на нараду наогул не зьвярнулі ніякай увагі: «Мы заняты, у нас зараз галоўная загатоўчая кампанія, спагнаньне падатку». Усё гэта добра, але зусім ня варта забывацца пра такі важны і адказны вучастак работы, як работа з селькорамі.

У выніку адсутнасьці ўсякай падрыхтоўкі нарада сарвалася. На нараду зьявіўся... адзін селькор.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што ў Талькаўскім сельсавеце няма ніводнай насьценнай газэты, у той час, як акрамя сельсавету ёсьць такія ўстановы і арганізацыі: спажывецкая каапэрацыя, с.-г. таварыства, партыйная і камсамольская ячэйкі, рабачком, мясцком чыгуначнікаў, 5 пачатковых школ і інш.

Але відавочна, што ні камсамольская, ні партыйная ячэйкі справе выданьня газэты не надаюць ніякага значэньня. «На што выдаваць насьценную газэту, калі выдаюцца газэты ў Менску».

«Вопыт» Пухавіцкага РК КП(б)Б і Талькаўскай партыйнай ячэйкі ў галіне кіраўніцтва насьценгазэтамі і селькорамі павінен быць улічаны нашымі іншымі партыйнымі арганізацыямі.

І. М.

Рэдакцыя газэты «Зьвязда» і Дом Камасьветы імя Карла Маркса наладжваюць у пятніцу, 1-га лістапада, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні Дому Камасьветы

ВЕЧАР ШЫРОКАГА АБГАВАРЭНЬНЯ

праекту новага ЗЯМЕЛЬНАГА КОДЭКСУ БССР

(Дакладчык—член калегіі НКЗБ тав. ВАШЧЫЛА-ВІРЫН)

На вечар запрашаюцца: рабкоры, нізавы партыйны, камсамольскі, прафсыйны і шэфскі актыў і чытачы газэты «Зьвязда»

ПАСЬЛЯ ДАКЛАДУ — КІНО

Білеты—у рэдакцыі газэты «Зьвязда», у канцэлярыі Дому Камасьветы і РК КП(б)Б.

МЕНСК

Пачынаецца справаздачная кампанія гарсавету

У зьвязку з пастановай Прэзыдыуму ЦВК БССР аб перавыбарах саветаў у 1930 г. прэзыдыум гарсавету парашыў з лістапада пачаць справаздачную кампанію дэпутатаў гарсавету перад сваімі выбаршчыкамі. Дэпутаты будуць даваць справаздачу на сваіх прадпрыемствах. Агульная справаздачная кампанія гарсавету прыстасоўваецца да выбарчай кампаніі саветаў у пачатку 1930 г.

9-га лістапада старшыня гарсавету тав. Аксючыц зробіць даклад на пленуме савету аб рабоце прэзыдыуму.

Гутарка тав. Галадзеда з дэмабілізаванымі чырвонаармейцамі

Учора ў залі пасяджэньняў СНК адбылася гутарка старшыні СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДА з дэмабілізаванымі чырвонаармейцамі-адпускнікамі, якія ад'яжджаюць на вёску. Адпускнікі задалі тав. ГАЛАДЗЕДУ рад пытаньняў аб міжнародным становішчы СССР, аб зямельнай палітыцы, калектывізацыі, хлебазагатоўках і г. д. Гутарка працягвалася каля 4 гадзін.

Праект зямельнага кодэксу БССР на абгаварэньне рабочых мас

Аргаддзел ЦСПСБ разаслаў па прафарганізацыях праект зямельнага кодэксу БССР. ЦП саюзаў і акрпрафбюро прапанавана абгаварыць праект кодэксу ва ўсіх найбольш буйных фабзаўкомах, а таксама ў раённых прафарганізацыях. Да абгаварэньня кодэксу трэба прыцягнуць рабочыя масы.

Вынікі абгаварэньня, а таксама і ўнесеныя ў кодэкс зьмены ці дадаткі трэба накіроўваць у акрпрафбюро і ЦП прафсаюзаў.

Дадатковая падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі

Агульны сход супрацаўнікоў ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМВ і Музэю Рэвалюцыі, у адказ на выклік маскоўскіх і ленінградзкіх рабочых, пастанавіў дадаткова падпісацца на 3-ю пазыку на суму ня менш паловы месячнага заработку.

Агульны сход выклікае калектывы супрацаўнікоў ЦВК, ДПУ, ЦСПСБ, акругкомаў і райкомаў партыі і камсамолу.

Ранейшая падпіска на пазыку дала па калектыве 100 проц. месячнай заработнай платы.

Пачыканьне супрацоўнікаў „Саюзхлеба"

Супрацоўнікі Беларускай канторы Саюзхлеба, заслухаўшы інфармацыю аб ходзе хлебазагатовак, пастанавілі: лічыць сябе мабілізаванымі на ўвесь час хлебазагатовак і праводзіць сваю працу на працягу 8½ гадзін кожны дзень з тым, каб дадатковыя паўтары гадзіны працы выконваць дармова. Час працы ўстанавіць з 8½ гадзін раніцы да 5 гадзін увечары.

Супрацоўнікі Саюзхелба выклікаюць супрацоўнікаў іншых загатоўчых арганізацый: Белкаапсаюзу, Белсельсаюзу, Менскія акр. аддзяленьні іх і пэрыфэрыю пасьледваць іх прыкладу. Ц.

ЗА ДЗЕНЬ

Рабочых на гаспадарчую работу. Рабочы хлебазаводу тав. Малава выручаны на пасаду намесьніка загадчыка камэрцыйнага аддзелу Белхарчтрэсту.

Прымацаваньне дэлегатак да сэкцый гарсавету. Прэзыдыум гарсавету парашыў прымацаваць да сэкцый савету для практычнай работы 250 дэлегатак новага скліканьня.

Беларуская трактарная калёна. Нарада старшынь фабкомаў саюзу мэталістых выказалася за падтрыманьне прапановы і газэты «Зьвязда» аб арганізацыі збору сродкаў на стварэньне беларускай трактарнай калёны. Пытаньне гэта будзе абгаварвацца на шырокіх сходах рабочых.

Забаронены пераманьваньні спэцыялістых

За апошні час наглядаюцца частыя выпадкі пераманьваньня спэцыялістых савецкімі і гаспадарчымі органамі. Гэта дэзарганізуе работу ўстаноў і існуючую сыстэму зарплаты.

ЦКК-НКРСІ пастанавіла катэгарычна забараніць пераманьваньне спэцыялістых і папярэдзіць усіх кіраўнікоў устаноў, што яны будуць прыцягвацца да адказнасьці за парушэньне гэтай пастановы.

„Дом Друку" ў Менску

У прэзыдыум гарсавету ўнесены праект пабудовы ў Менску вялікага Дому Друку.

Згодна пастановы Эканомнарады, будаўніцтва павінна быць распачата вясною 1930 году. У Доме Друку будуць разьмешчаны: газэтна-журнальна-кніжная друкарня, усе рэдакцыі гораду і Белдзяржвыдавецтва. Для Дому Друку намечана адвесьці вялікі вучастак на рагу Чырвонамысьлянскай і Грыгор'еўскай вул.

Музычныя пастаноўкі ў рабочых клюбах

Гэтымі днямі яўрэйская дзяржаўная студыя скончыла „кампазыцыйную працу над паэмай «Бройт» (хлеб), якую напісаў вядомы яўрэйскі паэта **Н. Харык**. Музыку на словы паэмы напісалі кампазытары **Крэйн, Мільнэр і Палонскі**. Паэма складаецца з 8 частак. Для пастаяннай работы ў студыі запрошаны прафэсар **Байнаціч** і піяністы **Жыў**. Агульнае мастацкае кіраўніцтва даручана **С. Палонскаму**.

Гэтымі днямі яўрэйская студыя будзе ставіць паэму «Бройт» у музычнай апрацоўцы у рабочых клюбах.

****

КУТОК МОПР'у

Мопраўцы ў паход па мяшкі

Менск. Згодна пастановы агульна-гарадзкой нарады актыву мопраўцамі праводзіцца на працягу чатырох дзён (28, 29, 30, 31-га кастрычніка) **збор мяшкоў у горадзе Менску для чырвоных эшалёнаў бульбы.**

Прынята пастанова зьвярнуцца да ўсіх членаў МОПР'у з адозвай здаваць мяшкі ў свае ячэйкі. На прадпрыемствах, па ўстановах, цэхах і г. д. праводзяцца экстраныя сходы з кароткай інфармацыяй аб чатырохдзённым па зборы мяшкоў. Вузаўскія і школьныя ячэйкі МОПР'у павінны скарыстаць вучняў для збору мяшкоў сярод іх бацькоў. Студэнцтва будзе скарыстана для ахопу неарганізаванага насельніцтва на акраінах гораду. На дапамогу мопраўцам заклікаюцца камсамольцы, піянэры і дэлегаткі жанаддзелу. Мяркуецца сабраць каля 2.000 мяшкоў.

Супроць кітайскіх белабандытаў

Бабруйск. 2-гі пленум Бабруйскага акругкому МОПР'у заслухаў інфармацыю аб становішчы зьняволеных савецкіх грамадзян ў Сумбэйскім лягэры ў Кітаі. Пленум катэгарычна запратэставаў супроць зьверскіх зьдзекаў над савецкімі грамадзянамі ў канцэнтрацыйным лягэры ў Сумбеі і патрабаваў палепшаньня становішча зьняволеных.

Пленум заклікаў усе мопраўскія арганізацыі ўзьняць свой голас пратэсту супроць бандыцкіх учынкаў кітайскіх мілітарыстых і ўзмацніць працу на зімовай дапамозе барацьбітом рэвалюцыі.

У адказ на гэтыя ўчынкі пленум пастанавіў заключыць дагавор на спаборніцтве паміж Бабруйскай і Магілёўскай арганізацыямі МОПР'у. Паводле дагавору, арганізацыі абавязваюцца **дабіцца павялічэньня радоў МОПР'у на 50 проц., зьліквідаваць на ўсе 100 проц. усе віды запазычанасьці, арганізаваць ва ўсіх вясковых райкомах, саўгаскіх і калгасных ячэйках мопраўскія палоскі, дабіцца індывідуальнай падпіскі на часопіс «Путь Мопр'а» ў горадзе 1 экз. на 10 членаў Мопр'у, у вёсцы 1 экз. на 20 членаў Мопр'у, правесьці па ўсёй арганізацыі падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.**

***

2-гі пленум Бабруйскага акругкому МОПР'у сабраў па падпісным лісьце **22 рублі 60 коп., пачаўшы гэтым кампанію зімовай дапамогі палітзьняволеным і іх сем'ям, і выклікаў усе ячэйкі МОПР'у Бабруйскай і Магілёўскай акругі пасьледваць іх прыкладу.**

ЦУДЗІН.

Спартакаўцы на карысьць палітзьняволеным

Шклоў. Рабочыя папяровай фабрыкі «Спартак» па дакладу вядомае рэвалюцыянэркі тав. Казінецкай (бабушкі Данбасу) пастанавілі адлічыць у фонд дапамогі палітзьняволеным **зарплату за адзін рабочы дзень, што складае больш 1.000 рублёў.** Адначасова пастанавілі калектыўна ўступіць у рады МОПР'у. Адна зьмена рабочых (200 чалавек) пастанавіла **адлічваць кожны месяц аднагадзінны заработак на карысьць МОПР'у.** Рабочыя пастанавілі выклікаць рабочых фабрык «Гэрой Працы», «Чырвоная Зорка» і «Прафінтэрн» пасьледваць іх прыкладу.

Апарат саматужнай каапэрацыі яшчэ не аздароўлены

На старонках нашага друку ўжо досыць грунтоўна высьвятлялася ўся тая шкодная работа, якую вялі кіраўнікі саматужна - прамысловай каапэрацыі ў Беларусі, асабліва ў Менскім аддзеленьні. Аб правай практыцы ў сыстэме саматужна - прамысловай каапэрацыі вынесена адпаведная пастанова Менакругкомам і АКК-РСІ, але і да гэтага часу там ня ўсё абстаіць добра. Прычаны ня ўсё абстаіць добра. Прычаны ў сампрамкаапэрацыю новыя работнікі замест зьнятых, ня гледзячы на тое, што яны лічацца там па 6-7 месяцаў, фактычна да працы яшчэ не прыступілі.

Так, тав. **Барткевіч** — загадчык аддзелу — пасьля свайго прызначэньня быў пасланы, як член праверкому, для праверкі Аршанскай партарганізацыі і да гэтага часу заняты на чыстцы парты. Яго намесьнік тав. **Шпэр** таксама чамусьці перакінуты на другую работу, а яго месца займае новы маласпрактыкаваны работнік.

Цяпер аб апараце. Інструктарскі склад Белсампрамкаапэрацыі зьяўляецца важным касьцяком ва ўсёй працы саматужна-прамысловай каапэрацыі, але ён вузкім і непрактычны ў сім яшчэ малады і непрактычны ў тай рабоце.

Інструктар, акрамя арганізацыі работы, павінен даваць указаньні розных відах вытворчасьці, як напрыклад: швэйная, мэталёвая, цукерная і інш. Між тым, у Белсампрамкаапэрацыі на інструктара ўскладаецца абслугоўваньне да 45-50 арцеляй, ясна, што такой нагрузцы інструктар ня можа ня насьцюю справіцца са сваёй работай.

З боку кіраўнікоў каапэрацыі на дакладнай устаноўкі па рознага роду прынцыповых пытаньнях.

У Менскім аддзяленьні сампрамкаапэрацыі няма жаднага пляну ў работы. Уся работа праходзіць самацёкам, без кіраўніцтва. У працы работнікаў аддзяленьня адсутнічае дысцыпліна, канцылярыі вельмі часта прападаюць вельмі важныя паперы.

Вось чаму РСІ павінна праверыць, выканала Менскае аддзяленьне саматужна-прамысловай каапэрацыі пастановы органаў РСІ, бо ў адваротным выпадку мы не гарантаваны, што гэтыя памылкі будуць паўтарацца і ў далейшым.

РЭАГУЮЧЫ.

Расьсьледваньне аўтамабільнай катастрофы

Скончыла працу камісія па высьвятленьні прычын катастрофы аўтамабілю, які належаў аўтадораўскай ячэйцы заводу «Энэргія». Аб гэтым здарэньні ў свой час пісалася ў «Зьвязьдзе». Камісія ўстанавіла, што мэханізм машыны ў часе яды быў не ў парадку. Вязьдзейнічаў націсканы тормаз і быў папсаваны руль. Кіраўнік машыны прыйшоў з-за гэтага ў замяшаньне і ня мог спыніць аўтамабілю, які скінуўся ў роў па Мала-Татарскай вуліцы.

Праўленьне Аўтадору забараніла сваім ячэйкам практыкаваць вучэбную аўтамабільную яду ў цэнтру горада без вопытных інструктароў. Навучальнае ўпраўленьне павінна праводзіцца на пляцох 1 ў бязьлюдных мясцовасьцях гораду.

Вылучана спэцыяльная камісія па тэхнічнай праверкі аўтадораўскіх машын і пэрыядычнага інструктажу кіраўнікоў гуртко ў. Акрамя гэтага праўленьне Аўтадору ўзьняло пытаньне перад Менгарсаветам аб устанаўленьні суровых правіл вулічнага руху ў горадзе.

Археалёгічныя досьледы на Гомельшчыне

У верасьні і кастрычніку археолёгам І. Х. Юшчанка зроблены археалёгічныя досьледы ў Камарынскім раёне, Гомельскай акругі.

Па берагох рэк, якія працякаюць праз Камарынскі раён (Дняпро Брагінка з прытокамі Несьвіж і Лебедзеўка) і на дзюнах на балотах ім адкрыты 32 стаянкі першабытнага чалавека. 4 старажытных паселішчы, а таксама знойдзена 8 радзішч і 22 курганы.

Частка стаянак адносіцца да позняга неаніта веку (нэоліт), а большасьць — бронзавага пэрыяду; курганы, відаць, належаць да 9-11 стагодзьдзя.

Увесь матар'ял, здабыты досьледамі, паступіў у катэдру археалёгіі Беларускай акадэміі навук.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— У чацьвер, 31-га кастрычніка, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Камуністычнае асьветы імя Карла Маркса адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне дэлегатак Кастрычніцкага раёну скліканьня 1928-1929 году.

Пасьля ўрачыстай часткі будзе даны канцэрт.

Старыя і новыя дэлегаткі ўваходзяць па сваіх дэлегацкіх кніжках, ўсе іншыя па білетах, разасланых па ячэйках. Усім жанарганізатарам і пазьней 30-га кастрычніка трэба атрымаць білеты ў РК.

На час вечару пры Доме будзе адкрыты дзіцячы пакой.

Дом Камасьветы імя Карла Маркса. У габінэце партработы, пачынаючы з 30 кастрычніка, штотыднёва будуць праводзіцца **кансультацыі па палітэканоміі**—ад 7 да 9 гадзін увечары для партактыву і для тых, хто займаецца самаадукацыяй.

— З 30-га кастрычніка Менцерабкоп пачынае раздачу талёнаў на дадатковую партыю галёш. Каапкамісіі і ўпаўнаважаныя атрымліваюць талёны в тых крам, да якіх яны прымацаваны для атрыманьня галёш.

Дом пісьменьніка. Сёньня, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому пісьменьніка (Савецкая, 68) адбудзецца другое пасяджэньне камісіі па ўшанаваньні памяці пісьменьніка Паўлюка **Труса.** Просьба да ўсіх арганізацый, якія запрошаны ў камісію, прысылаць сваіх прадстаўнікоў.

У сераду, 30-га кастрычніка, а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні 2-й сямігодкі (Ленінскай, 21, супроць поштаў), склікаецца сход выкладчыкаў і старост вячэрняй саўпартшколы па пытаньні пераходу на 10-днёўку.

Яўка абавязкова.

Вучразьмярк ЦК КП(б)Б просіць т. Бялыну-Падгаецкага зайсьці ў ЦК КП(б)Б, пакой № 6.

Прэзыдыум Менскага таварыства паліткатаржан і ссыльна-пасяленцаў просіць усіх таварышоў, якія ў канцы 1915 і ў пачатку 1916 гадоў сядзелі ў Віцебскай турме, зьявіцца ў прэзыдыум (Энгельса 30-47) вельмі па важнай справе.

Зьяўляцца можна ад 7 да 9 гадзін увечары штодзённа.

У суботу, 2-га лістапада, а 6 гадзіне ўвечары ў чыгуначным клюбе імя Леніна (пасажырская станцыя) адбудзецца адкрытае пасяджэньне бюро скаргаў НК-РСІ.

Будуць разгледжаны пытаньні:

1) Аб няправільным прыняцьці (біржы працы) на службу гр-на Камісара начальнікам станцыі Мен. пасажырскай.

2) Скарга адміністрацыі п-к. агароднікаў на няправільную пастаноўку ўстоўкі гародніны МЦРК і Менселькрэдсаюз там.

3) Скарга Самахваладзіцкага аб адмове валага таварыства на Менселькрэдсаюз, дзякуючы несваячасовому пераданьню якога т-ва павінна плаціць 121 руб. 44 кап. за прастой.

4) Скарга чырвонаармейца Нікалаева на праўленьне ЖАКТ'у № 8.

5) Аб бюракратычных адносінах сваіх абавязкаў юрысконсульта Шэйнін.

6) Аб скрыўленьні клясавай лініі Менскім акрэа пры вырашэньні справы абразцы зямлі Тарасэвіча.

Выклікаюцца рабочыя засядацелі Кішук, Шымес, Каждан, Нікіціч, Мацкевіч і Асоўскі (завод «Камунар»), Шэйнін, Васільлева, Коўнэр, (хэмфарма), Чарнецкая, Белан, Дэкер, Ліпкер, Пуняк і Аршанскі (завод «Вальшаніка»).

Запрашаюцца таксама члены ад чыгуначнікаў.

Пэдгабінэт. У сераду, 30-га кастрычніка, а 5-й гадзіне ўвечары сход школьнікаў школ гор. Менску.

Парадак дня: 1) Аб Кастрычніцкіх сьвятах., 2) Аб пераходзе на бесьпынны тыдзень. Яўка загадчыкаў абавязкова.

БДУ. Для студэнтаў БДУ ўсіх факультэтаў і курсаў на 31-га кастрычніка прызначаецца выхад у поле. Збор каля будынку пэдфаку, а 8 з палавой гадзінаў раніцы. Яўка абавязкова ў тым ліку ўсіх рабочых і служачых.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Пятніца, 1 лістапада — Спэктакль для рабочай моладзі. Білеты ў Доме Камсамолу — Д. Бергельсон — ГЛУХІ

Субота, 2 лістапада — Спэктакль для саюзу будаўнікоў. Білеты ў саюзе і рабачкомах

Нядзеля, 3 лістапада — Адкрыты спэктакль. Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру — А. Вагнэрке — БОТВІН

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — ПРЭМ'ЕРА МАСТАЦКІ БЛЯВІК Вытворчасьць—„Межрабпом-фільм" РАЗЛОМ. Звыш праграмы кіно-хроніка „Савкіно" № 56. Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ — ЯК ЧАСАМ БЫВАЕ. драма ў 6 частках. Звыш праграмы: хроніка „Савкіно" № 58. Пачатак 1 сэансу а 7 г. 15 м. Каса—ад 5 г.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — —) МАСТАЦКІ НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ (— ГОРНАЯ БАЛЯДА. драма ў 7 частках з пралёгам. Пачатак сэансаў роўна а 7 гадзіне увечары. Каса—ад 5 з пал. гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР" — Цікавы фільм вытв. „Совкино" ЛЯСНЫЯ ЛЮДЗІ (УДЭ). Краязнаўчы нарыс у 5 ч. Звыш праграмы кіно-хроніка „Совкино", прысьвечаная міжнароднаму юнацкаму дню ў Маскве. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Па нядзелях і серадах ад 12 гадз. дня. Пачатак 1-га сэансу ад 2 гадз.

КІНО СПАРТАК — Гастролі папулярных сатырыкаў С. М. І М. Г. ГУДАЛАВЫХ —) НА ЭКРАНЕ (— ОСІ АСВАЛЬД у выдатн. фільме ГЭТА МОЙ ЖАНІХ. камэдыя ў 6 част. Каса—ад 5 г. Пачатак 1 сэансу а 6 г. 30 м.

АБВЕСТКА.

З прычыны перагрузкі электрычнай станцыі г. Менску, ЭЛЬВОД зьвяртае ўвагу ўсіх устаноў, прадпрыемстваў і грамадзян гор. Менску на неабходнасьць АБМЕЖАВАЦЬ КАРЫСТАНЬНЕ ЭЛЕКТРА-ЭНЭРГІЯЙ.

Усе ўстановы павінны толькі ў экстраных выпадках запальваць сьвет. Эканомія электра-энэргіі для патраб асьвятленьня дасьць магчымасьць задаволіць прамысловыя прадпрыемствы гор. Менску. У выпадку, калі ня будуць ужывацца захады ўстановамі і насельніцтвам да эканомнага карыстаньня сьветам, Эльвод прымушан будзе ВЫКЛЮЧЫЦЬ ЦЭЛЫ РАД АБАНЭНТАЎ.

Эльвод.

ПАДПІШЫЦЕСЯ НА ЛІСТАПАД і далейшыя тэрміны НА ГАЗЭТУ ЗЬВЯЗДА

орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75к.

«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісы

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крестьянский КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, ня ўпоўнаважанымі, газэтным бюро і газэтаносцамі.

Па акругах: Упоўнаважанымі газэты „Зьвязда", кіёскамі т-ва Друку і